ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і Паўлянцы

# ДЗЕДЗІЧ

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 3 (22)
ТРАВЕНЬ 2003

2 ЧАЛАВЕК У ЧОРНЫМ. трансфармацыя вобразу палітыка №1
6 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: ТРАВЕНЬ - СОНЦАМ САГРЭТЫЯ ДНІ
4 КУРАПАТЫ - БОЛЬ НАШАЙ КРАІНЫ?
8 «К НАМ ЕДЗЕТ N.R.M.»

# ЧЫРВОНА-ЗЯЛЁНЫ ДЗЕНЬ

ВОСЕМЬ ЛЕТ НАЗАД АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО ВСЕМ ПОКАЗАЛ, НА ЧТО ОН СПОСОБЕН. 14 МАЯ 1995 СОСТОЯЛСЯ ПЕРВЫЙ СУДЬБОНОСНЫЙ РЕФЕРЕНДУМ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ, НА КОТОРОМ РУССКИЙ ЯЗЫК ПОЛУЧИЛ СТАТУС ГОСУДАРСТВЕННОГО, А БЕЛО-КРАСНО-БЕЛЫЙ ФЛАГ И ГЕРБ "ПАГОНЯ" СМЕНИЛИСЬ НА ПОЧТИ СОВЕТСКИЕ И ТОГДА ЕЩЕ ДО БОЛИ ЗНАКОМЫЕ ГОСУДАРСТВЕННЫЕ СИМВОЛЫ.



Марш свабоды. 1999г. Фота: IREX/ProMedia

Именно в 1995 году мы поняли, что такое "сильная власть". Референдум сопровождали скандалы: незадолго до него появились "белые пятна" в крупнейших государственных газетах — был снят с печати доклад депутата Антончика о коррупции в команде Лукашенко. Потом под предлогом "поиска бомбы" из Верховного Совета "вынесли" депутатов, объявивших голодовку в знак протеста референдуму.

А потом был референдум, который все демократические силы поверг в шок. И тогда же бело-красно-белый флаг был разорван "на сувениры" и теми, кто сейчас у власти, и теми, кто от этой власти скрывается (например, экс-глава Администрации президента Иван Титенков).

**Теперешний лидер Объединенной гражданской партии Анатолий Лебедько входил в оппозиционную группу в парламенте — депутатский демократический клуб.**

— Верховный Совет 12-го созыва был очень разным по составу. Из 347 депутатов хорошо если сотня была в демократической группе. Остальные — это старая советская номенклатура, у которых было очень неопределенное как личное будущее, так и карьерное — одновременно с референдумом были и выборы депутатов ВС №13. И уже тогда властью был использован метод кнута и пряника: некоторых ночью "выносили" из зала, а некоторым "раздавали слонов". И если мы сейчас посмотрим на президентскую вертикаль — губернаторы, члены правительства, министерств, — там много депутатов Верховного Совета 12 созыва. Эти люди и принимали результаты референдума.

С моей точки зрения, референдум воспринимался как категорическое "нет". Особенно если учесть, что мы же принимали национальную символику в качестве государственной — бело-красно-белый флаг и "Пагоню". Ее надо было принять большинством — 2/3, и она была принята "голос в голос" благодаря, как ни странно, нынешнему генпрокурору Виктору Шейману. Тогда результаты принятия той символики попытались оспорить — сосед Шеймана нажал кнопку голосования за него. Но Виктор Шейман вернулся в зал и подтвердил, что это он просил коллегу проголосовать за принятие национальных символов в качестве государственных.

**Андрей Санников, международный координатор общественной инициативы "Хартия-97" в день референдума еще работал в МИДе и в этот день был в США:**

— Тогда было очень подавленное состояние. Всем было понятно, что смена символики означала смену политического курса страны. Это уже было ясно после избиения депутатов в парламенте.

Я об этом узнал практически первый — где-то в 5 утра. И, честно говоря, ждал от Верховного Совета решительных шагов. Если парламент не мог защитить своих коллег, если депутаты не проявили чисто человеческие качества, — то парламента нет, и депутаты не способны на политические поступки.

**Лидер Белорусской социал-демократической партии (Народная грамада) Николай Статкевич в то время надеялся, что референдум, по крайней мере, не пройдет в парламенте.**

— Референдум воспринимался как однозначно антибелорусская акция. Символика — вещь далеко не безобидная. Для десятков процентов людей в Беларуси бело-красно-белый флаг и герб "Пагоня" — вопрос принципиальный. Среди остального населения, которого большинство, красно-зеленый флаг и нынешний герб не являются таким вопросом. Как только сменится власть, — сменится и символика. Потому власть так агрессивно насаждает теперешнюю символику — даже на школьных дневниках. И так же резко сопротивляется любой демонстрации национальных символов. Поэтому даже 10 человек с бело-красно-белым флагом на улице — это важно.

Люди сами не знали, за что они голосовали. В Гомеле новую символику несколько раз вешали таким образом, чтобы зеленая полоса флага была сверху, — и думали, что это правильно. А над международным юношеским лагерем "БеЛаРусь" в качестве "нового белорусского флага" висело полотнище: две трети зеленого поля сверху и красная полоса снизу.

**Уже потом народ разберется, что он одобрил, и назовет символы государства "капустой" и "закатом над болотом". Но все же, наверное, надо было думать раньше и знать, что выбираешь.**

**«Белорусские новости»**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

## ПАРТЫЯ БНФ

**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**
- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**
- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
**Тэлефануй: (029) 660-57-41.**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Фонд "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Калі вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### "КАЖАН" ДЗЕЙНІЧАЕ

19 красавіка 15-цю сябрамі Моладзевай Ініцыятывы Палесся "Кажан" у в. Кажан-Гарадок (Лунінецкі р-н) была праведзена экалагічная акцыя па прыборцы смецця каля чыгуначнай станцыі. У акцыі таксама ўзялі ўдзел мясцовыя ўлады і жыхары вёскі, што адгукнуліся на папярэдне распаўсюджаныя аб'явы.

У бліжэйшым будучым сябры МІ плануюць абмеркаваць з мясцовымі ўладамі пытанне па ўсталяванні каля чыгуначнага прыпынку сметніц.

Сябрамі МІ "Кажан" рыхтуецца да выпуску дыялектны слоўнік Лунінецкага р-на, куды ўвойдуць рэдкія і спецыфічныя дыялектныя словы, устойлівыя выразы, легенды і паданні.

Збор матэрыялу працягваецца ўжо месяц. Слоўнік будзе распаўсюджаны па сельскіх і раённых бібліятэках, разлічаны ён на лінгвістаў-аматараў і прафесіяналаў, на тых, каму цікава моўная і фальклорная спадчына свайго народа.

Кантактны адрас: 225660 Лунінецкі р-н, в. Кажан-Гарадок, вул. Майдан, 46.

Тэл. (01647) 7 14 69 (Віталь Каратыш).

E-mail: vitalik20@rambler.ru

**Dzedzich week-news**

### ЧЫТАЕМ ПА-БЕЛАРУСКУ!

Сайт KAMUNIKAT http://kamunikat.net.iig.pl/ упершыню прапануе Вам кнігі, якіх не было раней на беларускай мове!

Унікальны падарунак для наведвальнікаў сайта: першы том выдання TERRA ALBA "Праблемы беларускага літаратуразнаўства", дзе Вы можаце знайсці матэрыялы, прысвечаныя творчасці Аркадзя Куляшова, пачытаць раздзелы "Афарызмы Максіма Багдановіча", "Максім Танк і еўрапейскае мастацтва" і шмат іншага.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**
**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА"**
**з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у пачатку ліпеня 2003 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 22-90-97 да 25.06.03.**

# ЧЕЛОВЕК В ЧЕРНОМ
## ЧАСТЬ ТРЕТЬЯ

ОДЕВАЯСЬ, ЧЕЛОВЕК НА САМОМ ДЕЛЕ «РАЗДЕВАЕТСЯ», ПОРОЙ ДЕМОНСТРИРУЯ ОКРУЖАЮЩИМ ГОРАЗДО БОЛЬШЕ, ЧЕМ ХОТЕЛ БЫ САМ. ЖЕСТЫ, МАНЕРЫ И ПРИВЫЧКИ МОГУТ РАССКАЗАТЬ О ЛЮДЯХ БОЛЬШЕ, ЧЕМ СКАЗАННЫЕ ИМИ СЛОВА. КОРРЕСПОНДЕНТ «БЕЛОРУССКОЙ ГАЗЕТЫ» ПРОСМОТРЕЛА ОКОЛО СОТНИ ВИДЕОСЮЖЕТОВ, ЗАПИСАННЫХ ЗА ВРЕМЯ ПРЕБЫВАНИЯ У ВЛАСТИ БЕЛОРУССКОГО ПРЕЗИДЕНТА. ВОЗМОЖНО, НЕКОТОРЫЕ НАБЛЮДЕНИЯ О ЕГО МАНЕРЕ ОДЕВАТЬСЯ И ВЕСТИ СЕБЯ ПРЕДСТАВЯТ ИНТЕРЕС ДЛЯ НАШИХ ЧИТАТЕЛЕЙ.

### НАРЯДЫ

А еще Лукашенко любит форму. Как военную, так и спортивную. Спортивную - особенно, да и поводов покрасоваться в ней гораздо больше, нежели в мундире главнокомандующего.

До пришествия А.Г. в спорт под номером 1 на хоккейную площадку выходили только вратари. Что совершенно не помешало нападающему (а Лукашенко играет центр-форвардом) подчеркнуть «единицей» свою исключительность даже на льду. Выделяет его и написанная на майке фамилия, наверное, для тех, кто не умеет считать.



**А. Лукашэнка разам з сынамі**

Александр Григорьевич умудрился оказаться законодателем и в армейской моде. Чего стоит одна его фуражка, сшитая из камуфляжной ткани! А погоны с внушительным гербом и роскошная парадная форма навевают воспоминания о богатых аксельбантах Каддафи и обожающих блестящее африканских генералах.

Кстати, любимая летняя одежда - рубашка с короткими рукавами и галстук - протокольный промах, который независимо от погоды никогда не позволяет себе Путин. Короткие рукава подразумевают галстук лишь в том случае, если речь идет о форме.

Интересно, что двух президентов роднит привычка носить часы на правой руке. Особенно это бросается в глаза на кадрах, где Путин и Лукашенко летом прошлого года дружно закладывают кирпичи в здание будущего российского посольства в Минске. У обоих президентов часы дорогие, на благородных кожаных ремешках.

### МЕТАМОРФОЗА

То, что в последние годы внешний вид президента резко изменился к лучшему, заметили практически все. Однако самое удивительное, что произошло это не постепенно, а в один день: 8 сентября 1999г., во время первого визита Путина в Минск в качестве премьер-министра Александр Григорьевич предстал в новом имидже.

Еще в августе Лукашенко зачесывал любимый клок волос и растрепанные усы, напоминающие два пучка жесткой соломы, а уже 8 сентября он вышел к камерам элегантно одетым и безукоризненно подстриженным. Президенту понадобилось всего пять лет для того, чтобы его внешний вид стал соответствовать занимаемой им должности. С уверенностью можно сказать о том, что изменение его внешнего вида благоприятно отразилось на работе телеоператоров: если раньше его можно было снимать только спереди (чтобы не была видна лысина), то сейчас его разрешено показывать сбоку и сзади.

Политика - это бесконечный маскарад, на котором политику важно каждый раз оказываться в том костюме, который будет идеально соответствовать конкретному моменту. Впрочем, какое-то время можно неплохо продержаться, прячась за одним и тем же пестрым лоскутным одеянием. До тех пор, пока тебя не начнут сразу узнавать по мелодичному перезвону колокольчиков на рогатой шляпе.

Манеры у Александра Григорьевича за годы президентства устоялись и по-прежнему оставляют желать лучшего. Чего, к примеру, стоит привычка обращаться на «ты» ко всем, включая женщин и стариков. Журналисты с президентской фамильярностью столкнулись еще во время его первой пресс-конференции.

Тогда «ты» досталось всем, включая ветерана белорусской журналистики, руководителя корпункта газеты «Труд» Сергея Ваганова, который, выслушав ответ, вежливо поблагодарил: «Спасибо, Александр».

Приятными исключениями из этого правила стали Ельцин, Путин да изредка встречающиеся на пути Лукашенко главы иностранных государств. Со своими - можно по-простому. А чего церемониться? Он - батька, а батька с детьми на «ты», что с младшенькими, что со старшенькими.



Вообще, с манерами у президента были проблемы все эти годы. Вспомним хотя бы битье посуды «на счастье» в кремлевских покоях. А привычка все время поправлять усы, волосы или костюм, почесывать подбородок выдает внутреннюю неуверенность и нервозность.

### ШУТКИ

Шутит он тоже, как правило, неудачно. Встреча с работниками МТЗ.

«Какие у вас проблемы?» - обращается президент к рабочим.

«Жилье», - отвечает женский голос. «Жилье или жулье?» - переспрашивает А.Г., убивая таким образом сразу двух зайцев: во-первых, сострил, во-вторых, перевел разговор с больной жилищной проблемы на любимую тему коррупции.

**«Белорусская газета»**

# ІМПРЭСІЯ НА ТЭМУ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

ИНТЕРЕСНО, А ВЫ СЕБЯ ЧУВСТВУЕТЕ ТАК ЖЕ, КАК И Я, КОГДА ЗВУЧИТ БЕЛОРУССКИЙ ГИМН? ВЫ ТОЖЕ НЕ ЗНАЕТЕ СЛОВ? Я НЕ ЗНАЮ. ЕСЛИ ЧЕСТНО, ТО И ЗНАТЬ НЕ ХОЧУ. НЕ ХОЧУ ПОТОМУ, ЧТО УВЕРЕН, - ПРОЙДЕТ КАКОЕ-ТО ВРЕМЯ И БУДЕТ НОВЫЙ ГИМН - ТОТ, СЛОВА КОТОРОГО Я ЗАХОЧУ ВЫУЧИТЬ. С ФЛАГОМ ТА ЖЕ ИСТОРИЯ: ОЧЕНЬ ТЯЖЕЛО ЛЮБИТЬ СОЧЕТАНИЕ КУМАЧОВОГО С БОЛОТНО-ЗЕЛЕНЫМ. ХОЧЕТСЯ АБСОЛЮТНО ДРУГОГО: ГЛЯДЯ НА ВЗДЫМАЮЩИЙСЯ БЕЛО-КРАСНО-БЕЛЫЙ, ПОЛОЖИТЬ РУКУ НА СЕРДЦЕ И ПЕТЬ "МАГУТНЫ БОЖА". ОЧЕНЬ ХОЧЕТСЯ.

В последнее время чувствую в себе неясные перемены - то ли отчаяние, то ли усталость. Ощущение огромного незанятого места внутри душевного пространства не дает покоя. Неприятие нынешней власти не впускает внутрь гордость за страну и радость за успехи соотечественников.

Пару дней назад позвонил брат. Голос на другой стороне телефонного провода восторженно произнес: "Ты слышал, наши стали чемпионами Европы?" В голове почему-то бежал биатлонист и палил на бегу из двух стволов автомата Калашникова. Я решил проверить: "Кто?" "Как это, кто?! Сборная по теннису - Самсонов со Щетининым!"

Ответ обескуражил: зная лично практически всю элиту настольного тенниса страны, проморгать победу, к которой наша сборная шла со времен глубокого застоя. Мне стало не по себе, - захотелось праздника. В голове поплыли лубочные картинки встречи победителей в аэропорту: блицы фотокамер, восторженные болельщики, выстрелы шампанского… Через секунду заставил себя успокоиться, представив, как толстомордый дядька из спорткомитета, рассекая животом толпу, подгребает к нашим чемпионам и надевает одному из них на шею огромный венок. На венке лента, на ленте надпись: "От Верховного Главнокомандующего и Президента Национального Олимпийского Комитета А.Г. Лука…", далее неразборчиво. Ехать в аэропорт вмиг расхотелось.

Включенный в воскресенье вечером телевизор заманил в кресло лихорадочно веселыми позывными "Мы начинаем КВН…" Не изменившийся за последние 40 лет Александр Масляков объявил состав участников: Урюпинский институт коневодства, Якутский университет субтропического хозяйства и Белорусский…. Два


«ЧП» г. Мінск

финала обещали положительные эмоции от нескольких шуток и возможную гордость от победы соотечественников.

Надо сказать, опасения подтвердились - белорусы, как всегда, были лучше всех. И в какой-то момент даже показалось, что мысли об убогости нашего бытия, растворившись в хохоте, уже никогда не вернутся… Но шутка про пожизненное президентство Лукашенко вернула мозг в прежнее состояние. Да в придачу к этому вспомнился текст Маслякова, до недавнего времени постоянно произносимый во время рекламных пауз: "Спонсор белорусской команды - Управление делами президента Республики Беларусь".

Белорусы вышли в следующую ступень с очевидным преимуществом, но радость отчего-то не была полной, а гордость не заполнила душевную брешь.

Доведение любой ситуации до абсурда не оставляет ни единого шанса даже для намека на пафос. Недавний концерт, посвященный памяти Владимира Мулявина, попытался убить во всех белорусах любовь к легендарному музыканту.


У. Мулявін. Фота: IREX/ProMedia

Состав участников концерта обескураживал: не к поводу веселая Эдита Пьеха, уставшая от жизни Нани Брегвадзе, вышедший в расход грузинский ансамбль "Орэро", да странный самодеятельный коллектив, называющий себя прославленным именем "Песняры". По причине тотального запрета на выступления в Беларуси, отсутствовал истинный продолжатель традиций Владимира Мулявина - ансамбль "Белорусские Песняры". Отсутствовали и музыканты, дружившие долгие годы с Мулявиным, и воспринимавшие его как пример музыкальной самодисциплины и как человека, преданного музыке до самозабвения.

Концерт был по-советски заунывен и по-чиновничьи бесталанен. Убогое сценическое оформление венчала колонка со стоящей на ней двухгрифовой гитарой "Gibson", некогда принадлежавшей музыканту. В финале концерта, когда, по замыслу режиссера, на щеку зрителя должна была навернуться слеза, лица публики залила краска стыда.

На сцену потянулись зрители первых рядов с одинаковыми букетами цветов, предварительно розданными организаторами действа. Они укладывали перед гитарой цветы ровными штабелями, а некоторые участники концерта целовали гитару, восприняв ее звукосниматели за стигматы Христа…

Вообще-то, просто очень хочется почувствовать себя гражданином. Хочется ощутить то, что ощущают жители цивилизованных стран. А пока смотришь на футболистов, положивших руку на сердце и поющих гимн перед началом матча, и сердце наполняет гордость за Англию, Бразилию, Португалию… Словом, за все страны, кроме одной. И вы ее знаете.

**charter97.org**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НЕПАМЕРНАЯ СТРАТА

14 красавіка пайшла з жыцця знакамітая дзеячка беларускай культуры, навуковец, беларусазнаўца, ганаровы сябра Саюзу беларускіх пісьменнікаў Зора Кіпель.

Зора Кіпель неаднойчы брала ўдзел у Канферэнцыях бібліятэкараў ЗША, займалася збіраннем і камплектаваннем беларускіх кніг славянскага аддзела бібліятэкі, арганізоўвала юбілейныя выставы вядомых беларускіх грамадскіх дзеячоў і пісьменнікаў. Правяла вялікую работу па апісанні і камп'ютарызацыі старадрукаў, падрыхтавала "Даведнік пра этнічныя групы штата Нью-Джэрсі". Як літаратуразнаўца яна засярodзілася на вывучэнні сярэднявечнай беларускай літаратуры, пераклала старабеларускі змест "Аповесці пра Трыстана" на англійскую мову, напісала да яе навуковы каментар і выдала асобнай кнігай у Гарландскай серыі сярэднявечнай літаратуры, выдала новае даследаванне "Этычныя элементы ў беларускім Трыстане XVI ст.".

**Паводле інфармацыйнага бюлетэня "Беларусы ў свеце"**

### "ПАН ТАДЭВУШ" - ПА-БЕЛАРУСКУ

Беларускі відэаклуб выдаў на відэа беларускі пераклад фільма Анджэя Вайды "Пан Тадэвуш" - экранізацыі аднайменнага твора нашага суайчынніка Адама Міцкевіча.

Дзея адбываецца на пачатку XIX стагоддзя ў Літве, як раней звалася Беларусь. Край - пад расейскай уладай, але да берагоў Нёмна набліжаюцца войскі Напалеона, што нясуць надзею на вызваленне. Да яго прыходу рыхтуецца вызвольнае паўстанне. Між тым ў маленькай вёсцы Сапліцова не сціхае звада паміж графскім родам Гарэшкаў ды шляхецкім Сапліцаў. Паспрыяць прымірэнню могуць пачуцці між іх маладымі нашчадкамі - Зосяй ды Тадэвушам. Тэкст беларускамоўнай версіі - паводле Пятра Бітэля з элементамі перакладаў Язэпа Семяжона і Браніслава Тарашкевіча. Фільм агучаны акцёрамі.

Набыць касеты магчыма: у Менску ў к/з "Менск" (ст.м. "Першамайская"), ТБМ, БНФ; у Гародні - пэйджар (0152) 73-0000 аб. 127302; 230003, Гродна-3, а/с 62; у Гомелі - па тэл. (0232) 45-11-51, Андрэй.

Берасцейскія відэааматары маюць цудоўную магчымасць набыць стужку, патэлефанаваўшы на офіс «Дзедзіча». Тэл. (0162) 22 90 97.

**Dzedzich week-news**

### НОВЫЯ ВЫДАННІ ДЛЯ ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ ЭКАЛОГІЯЙ

Грамадскім аб'яднаннем "Экаправа" выдадзеныя тры новыя брашуры для чытачоў, зацікаўленых у пытаннях экалогіі Беларусі. Выданні спн. Лаеўскай "Права на экалагічную інфармацыю" і "Абарона права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе", а таксама Т. І. Макаравай "Прававое забеспячэнне ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў" прысвечаныя аналізу экалагічнага заканадаўства Беларусі з пазіцыі яго суаднесенасці з нормамі Орхускай Канвенцыі. (Дадзеная Канвенцыя забяспечвае свабодны доступ грамадзянаў да любой экалагічнай інфармацыі.)

Атрымаць брашуры могуць усе зацікаўленыя. Кантактны тэлефон: (017)223 84 98, Алена Лаеўская.

**Dzedzich week-news**

# КУРАПАТЫ - БОЛЬ НАШАЙ КРАІНЫ?


Фота: IREX/ProMedia

МІНУЎ АМАЛЬ ГОД З ТАГО ЧАСУ, ЯК СКОНЧЫЛАСЯ АБАРОНА КУРАПАТАЎ. ТУТ У КАНЦЫ 1930-х гг. БАЛЬШАВІКІ ПРАВОДЗІЛІ МАСАВЫЯ РАССТРЭЛЫ МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ РОЗНЫХ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ І ВЕРАВЫЗНАННЯЎ. ВЫ СПЫТАЕЦЕ: «АД КАГО ТРЭБА БЫЛО БАРАНІЦЬ ГЭТЫЯ МЯСЦІНЫ?». АДКАЗ ВЕЛЬМІ ПРОСТЫ: КУРАПАТЫ ТРЭБА БЫЛО БАРАНІЦЬ АД СЛЕПАГЛУХАНЯМЫХ СТВАРЭННЯЎ, ЯКІЯ ДОЎГІ ЧАС НЕ ЖАДАЛІ НЕ ТОЕ ШТО ЗМЯШЧАЦЬ ІНФАРМАЦЫЮ ПРА ГЭТАЕ УРОЧЫШЧА Ў ПАДРУЧНІКАХ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ, АЛЕ НАВАТ І ЧУЦЬ НЕ ХАЦЕЛІ ПРА МЕСЦА МАСАВАГА ГЕНАЦЫДУ НАРОДУ. ВЯРШЫНЯЙ АМНЕЗІІ ЦЯПЕРАШНЯГА ЎРАДУ СТАЛА БУДАВАННЕ КАЛЬЦАВОЙ АЎТАДАРОГІ, ЯКАЯ ПА ПЛАНЕ ПАВІННА БЫЛА ПРАХОДЗІЦЬ У ПРАМЫМ СЭНСЕ ПА ЛЮДСКІХ КАСЦЯХ.

У выніку супрацьдзеяння неабыякавых людзей Курапаты не сталі чарговым участкам дарожнага палатна, падуладнага якому-небудзь АўтаДарТрансу. На сённяшні дзень не пастаўлена канчатковая кропка адносна гэтай справы.

Каб прыадкрыць заслону на тыя падзеі, якія адбываліся ва ўрочышчы Курапаты год таму, мы сустрэліся з Алесем Цялегіным, чалавекам, які быў адным з ініцыятараў стварэння Моладзевай Ініцыятывы ў абарону Курапатаў.

**- Прывітанне Алесь, адразу пачну з пытання, якое мяне, як чалавека прагматычнага, хвалюе ў першую чаргу.**

**Адкуль пайшлі звесткі аб тым, што Курапаты з'яўляюцца месцам генацыду народу?**


Фота: IREX/ProMedia

- Інфармацыя пра гэтыя мясціны з'явілася на пачатку 1990 гадоў у выданнях Зянона Пазняка. А ўжо значна пазней, калі мы заступілі на "вахту", у размовах з жыхарамі высветлілася, што ў некаторых людзей дагэтуль захаваліся паперы з КДБ БССР, у якіх паведамлялася, што, напрыклад, бацька або маці расстраляныя ва ўрочышчы, якое на той час мела назву Курапаткі.

**- Атрымліваецца, што знішчэнне людзей - гэта справа НКВД БССР?**

- Так, гэта праўда. ¨сць яшчэ жывыя сведкі гэтых падзей, якія на той час былі падлеткамі. Да нас прыходзіў нават былы НКВДшнік, які распавядаў пра падзеі тых часоў. У прыватнасці, ён расказаў, што ў людзей стралялі з рэвальвераў. Кожнаму супрацоўніку давалі па шэсць патронаў, і ён павінен быў прынесці шэсць гільз.

**- Абарона Курапатаў пачалася пасля пачатку будаўніцтва кальцавой дарогі вакол Менску?**

- Менавіта так, першымі сюды прыйшлі прадстаўнікі партыі БНФ, якія даведаліся пра пачатак будаўніцтва дарогі ў гэтых мясцінах, а пасля сюды пачалі з'язджацца ўсе неабыякавыя да нашага мінулага людзі. У выніку чаго пачалося актыўнае супрацьстаянне ўладам.

**- Алесь, перад тым, як ісці на канфлікт з ўладамі, ці былі прыняты нейкія намаганні, каб знайсці нейкі іншы шлях вырашэння гэтага пытання?**

- З пачаткам будаўніцтва МКАДа пачалі выходзіць на кіраўнікоў будаўніцтва. Дарэчы гэта была вельмі слушная думка, таму як яны таксама разумелі значэнне гэтага месца, але ж самі, без дазволу вышэйшага кіраўніцтва, нічога зрабіць, на жаль, не маглі.

**- А вышэй за гэтых кіраўнікоў не звярталіся. Напрыклад, да А.Р. Лукашэнкі?**

- Звярталіся... Калі ведаеш, была ўтворана Ініцыятыва ў абарону Курапатаў - туды ўвайшло ўсё старэйшае пакаленне. А праз пэўны час была ўтворана Моладзевая Ініцыятыва ў абарону Курапатаў, якая складалася з маладога пакалення, што знаходзілася ўвесь гэты час на тэрыторыі пахавання. І ад імя гэтай другой Ініцыятывы мы звярталіся куды толькі было магчыма. Было распрацавана два праекты будаўніцтва гэтай аўтадарогі: паралельна гэтай дарозе ідзе яшчэ адна, і мы прапаноўвалі менавіта там правесці МКАД. Пасля з кіраўніцтвам МКАДа, калі гэтая праблема атрымала шырокі розгалас у грамадстве, мы усё ж такі прыйшлі да агульнага паразумення.

**- Што ты маеш на ўвазе?**

- Па праекце, пад час будаўнічых работ планавалася вырубка часткі прыдарожнага лесу з вывазам верхняга слою грунту, які прадстаўляе сабой вялізны магільнік. У выніку пагаднення была пабудавана значна вужэйшая дарога.

**- Добра, але ж я ведаю, што перад тым, як прыйсці да пагаднення з уладамі, у вас былі сутычкі з міліцыянтамі. Я нават бачыў фотаздымкі, на якіх бульдозеры засыпаюць драўляныя крыжы разам з жывымі людзьмі, што спрабавалі іх спыніць.**

- Так, гэтыя падзеі мелі месца 9 і 10 лістапада, калі зранку да нас прыехалі міліцыянты з загадам высяліць нас з імправізаванага лагеру, таму што мы перашкаджалі ў будаўніцтве МКАДа. Перад гэтым была зроблена правакацыя: побач з урочышчам была бойка, і міліцыянты заявілі нам, што недалёка быў знойдзены нябожчык, і яны збіраюцца праводзіць следства.


Фота: IREX/ProMedia

Міліцыянты пахадзілі, паглядзелі. Я гляджу: пачалі падцягваць салдатаў, АМАП, мы пачалі адразу тэлефанаваць – прыбеглі людзі і пачаліся сутычкі.

А што датычыцца бульдозераў, то гэтыя падзеі мелі месца. Мы сталі насупраць бульдозера, а кіроўца нават не спыніўся, ён сыпаў, сыпаў і сыпаў да таго моманту, пакуль нас, закапаных па грудзі, не выцягнуў АМАП. Ні мы, ні бульдозер не хацелі сыходзіць. Яшчэ нас травілі газам, білі дубінкамі, шмат хто пасля гэтых падзей апынуўся ў шпіталі, многія былі затрыманыя, я ў тым ліку.

**- Што было з тымі людзьмі, якіх затрымалі?**

- Некаторыя атрымалі суткі арышту, астатнія вымушаны былі сплочваць вялізныя штрафы.

**- Алесь, пасля пагаднення з кіраўніцтвам МКАДа, як скλаліся лёсы людзей, якія былі стваральнікамі і актыўнымі ўдзельнікамі Ініцыятыў у абарону Курапатаў? Я чуў, што некаторыя з іх падвяргаліся пераследу з боку цяперашняй улады.**

- На жаль, гэта праўда. Асабіста мяне на пачатку чэрвеня ўдарылі нажом. Не ведаю: ці было гэта звязана з маёй дзейнасцю ў Курапатах, але ж факт меў месца. Астатнія хлопцы, якія ўдзельнічалі ў абароне, былі звольненыя хто з навучальных устаноў, хто з працы.

**- З моманту заканчэння абароны прайшоў год, які выгляд маюць зараз Курапаты?**

- Зараз ва ўрочышчы зроблены народны мемарыял: намаганнямі людзей пабудавана дарога памяці. Намі была ўзноўлена лавачка, якую падараваў Біл Клінтан, калі наведваў Беларусь і гэтыя мясціны ў прыватнасці.

**- Беларусь, на жаль, багатая на падобныя мясціны. Які лёс чакае падобныя Курапатам урочышчы, раскіданыя па ўсёй краіне?**

- Такія месцы будуць выкрывацца, у гэтым зацікаўлены беларускія археолагі. Інфармацыя аб гэтых мясцінах будзе даводзіцца да свядомасці людзей, таму што гэта наша гісторыя, а ад гісторыі мы сыйсці нікуды не можам.

**- Дзякуй Алесь за шчырую размову. Жадаю табе далейшага поспеху.**

**Ну што ж, шаноўнае спадарства, мы зрабілі спробу пазнаёміць вас з яшчэ адной старонкай гісторыі Беларусі. На жаль, яна аказалася зноў не такога светлага і радаснага колеру, як хацелася б нам усім.**

**Наўмысна не падводжу ніякіх высноваў з вышэй прыведзенай размовы, хачу сказаць толькі адно: у якой краіне нам жыць, – павінны вырашаць мы самі, і якія помнікі будуць стаяць у нашай краіне, – Леніну ці ахвярам ленінізму-сталінізму - вырашаць трэба таксама нам.**

**Гутарку вёў Андрусь ЛЯЎЧУК**

# СВЯТА ПЕРАМОГІ

СВЯТА 9 ТРАЎНЯ. ЯШЧЭ АДЗІН НАБЫТАК БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ З САВЕЦКІХ ЧАСОЎ. З ГЭТАЙ НАГОДЫ МЫ ВЫРАШЫЛІ ЗВЯРНУЦЦА ДА БЕРАСЦЕЙСКАЙ МОЛАДЗІ З ПЫТАННЕМ: "ШТО ДЛЯ ВАС ЗНАЧЫЦЬ СВЯТА 9 ТРАЎНЯ СЁННЯ? ЦІ АДЗНАЧАЕЦЕ ВЫ ЯГО, КАЛІ АДЗНАЧАЕЦЕ, ТО ЯКІМ ЧЫНАМ?"

Прадстаўляем Вашай увазе некаторыя, найбольш распаўсюджаныя адказы.

**Вольга, 16 гадоў, навучэнка.**

- Для мяне свята 9 траўня - гэта звычайнае свята, яшчэ адзін выходны дзень. Але я вельмі паважаю тых людзей, якія абаранялі сваю краіну цаной свайго жыцця. Я ўдзячная ім за гэта. І на традыцыйны мітынг у Берасцейскую крэпасць іду не таму, што прымушаюць, а таму, што кліча ўнутраны абавязак. Гэтым я выказваю сваю ўдзячнасць удзельнікам вайны - абаронцам маёй свабоды і майго жыцця.

**Сяргей, 21 год, студэнт IV курса.**

- Это день памяти тех людей, кто отдал свою жизнь, здоровье на борьбу с фашизмом, чтобы не допустить превосходства одной нации над другими, чтобы спасти свою мечту. Мечту, может и неприемлемую нами сегодня. Ведь боролись, вроде как, с фашизмом, а спасали сталинизм. Но все-таки...

Считаю, что это не мой праздник, а тех, кто воевал. Отмечаю его как обычный выходной, в компании с друзьями.

**Кацярына, 19 гадоў, навучэнка.**

- На сённяшні дзень 9 траўня - гістарычнае свята. У гэты дзень асаблівую значнасць набывае мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць. Для мяне і маіх сяброў стала традыцыяй наведваць гэтае месца трагічных падзей менавіта 9 траўня. Шкада, што для некаторых гэты памятны дзень – яшчэ адна нагода "напіцца і забыцца".

**Юліана, 19 гадоў, студэнтка III курса.**

- Для мяне свята 9 мая - звычайны дзень. Вайна не кранула нашай сям'і: усе мае бабулі і дзядулі, іх браты і сёстры засталіся жывыя. Але, канешне, я адчуваю гонар за людзей, якія пераадолелі ўсе цяжкасці і перамаглі ў бязлітаснай барацьбе, адчуваю боль па загінуўшых. Вайна - катэгорыя панадчасовая, яна павінна ўспрымацца як урок наступнымі пакаленнямі.




**Алена, 20 гадоў, студэнтка III курса.**

- 9 мая - гэта свята-напамін пра вайну. Чалавек - самая дзіўная жывёла, не ведае, што яму патрэбна, часта не бачыць сапраўднага сэнсу жыцця, пакутуе з прычыны недасканаласці сваіх інстынктаў і забівае сябе і сабе падобных. Лічу, што свята гэтае дапамагае яшчэ раз задумацца над сваімі памылкамі, над лёсам сваёй Радзімы. Свята не адзначаю (у традыцыйным сэнсе гэтага слова), але для мяне гэта дзень памяці. Калі нават сучасная моладзь праз дым цыгарэтаў і з бутэлькай піва ў руках гаворыць: "Як добра, што ў нас няма вайны!". Сапраўды, добра.

**Аляксей, 24 гады, аспірант.**

- Зразумела, лічу дзень 9 траўня святочным. Вайна гэтая забрала шмат жыццяў, нельга пра гэта не памятаць. Хаця і не ўсё было так, як падавалася ў падручніках па гісторыі за савецкім часам. Шмат людзей у 1939 - 1944 гг. загінула зусім не на вайне і зусім не ад фашыстаў. Таму для мяне 9 траўня - перш за ўсё дзень памяці ахвяраў таталітарызму: фашызму і сталінізму.

Дзень памяці мільёнаў ахвяраў і кожнага трэцяга беларуса. Так, па апошніх дадзеных, кожнага трэцяга...

Вось такім чынам успрымае сёння берасцейская моладзь дзень 9 траўня. Адказы на простае пытанне ператвараліся часамі ў зусім не дзіцячыя развагі пра вайну і сэнс чалавечага жыцця. Як бачыце, для большасці маладых людзей гэты дзень ёсць днём памяці ахвяраў вайны. Таму можа рана яшчэ казаць пра абыякавасць моладзі да гісторыі народа?

Ад сябе хачу дадаць: часам варта ўспомніць. Хаця б 9 траўня. Бо гэта не чыёнебудзь - нашае. Нашымі людзьмі пражытае. Гісторыя нашага народа, ад якой мы не адмаўляемся, якую цэнім.

Ведаем. Памятаем.

**Запытвала Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# КАВА З ВОДАРАМ «ЦЫВІЛІЗАЦЫІ»

ЭПОХА ГЕАГРАФІЧНЫХ АДКРЫЦЦЯЎ ПРЫНЕСЛА «СТАРОМУ» СВЕТУ ТЫТУНЬ І КАВУ. КАЛІ АДНОСНА ШКАДЛІВАГА ЎПЛЫВУ ТЫТУНЮ ЎСЁ БЫЛО ВЫРАШАНА ЯШЧЭ Ў МІНУЛЫМ СТАГОДДЗІ, ДЫК У НАВУКОВЫМ І МЕДЫЦЫНСКІМ СВЕЦЕ АБ КАРЫСНАСЦІ КАВЫ СПРАЧАЮЦЦА ДАГЭТУЛЬ. АДНО МОЖНА СКАЗАЦЬ З ДАКЛАДНАЙ УПЭЎНЕНАСЦЮ - СПАЖЫВАННЕ НЕДАБРАЯКАСНАЙ КАВЫ ШКАДЛІВА АДБІВАЕЦЦА НА ВАШЫМ НАСТРОІ.

Неяк нядаўна, прагульваючы сумную пару ці то па логіцы, ці то па філасофіі (пры ўсім маім захапленні навукамі, для мяне гэтыя прадметы мала чым адрозніваюцца), вясновым ветрыкам быў я занесены ў адну невялічкую кавярню. І, каб хоць крыху забіць час ды адагнаць "агульную млявасць і абыякавасць да жыцця", вырашыў замовіць я сабе кубачак кавы. Надвор'е было веснавое, за вокнамі спявалі птушкі, ззяла сонейка і нічога не прадракала бяды (даруйце мне, калі ласка, гэтае лірычнае адступленне).

Адстаяўшы чаргу да касы (аказалася, што я не адзін такі красавіцкі, якому не сядзіцца на парах), атрымаў за пэўную суму грошаў пластыкавы «стаканчык» з субстанцыяй карычневага колеру на дне і накіраваўся да "забраніраванага" месца. Я, канешне, ведаў, што кава ў барах – гэта не амброзія, не цудоўны нектар і нават не напой пераможцаў, але тое, што паўстала перада мной, было сапраўднай нечаканасцю.

Наконт водару гэтай вадкасці можна сказаць толькі адно - кава з водарам «цывілізацыі» (маю на ўвазе пах пластыку). Паглядзеўшы на колер змесціва "кубка" я нечакана для сябе прыгадаў радкі знаёмыя з дзяцінства: "Не ветер бушует над бором, не с гор побежали ручьи...". І ўзнікла ў мяне такое адчуванне, што гэтыя самыя "ручьи" ўсе да аднога нахабна збяжаліся чамусьці менавіта ў мой пластыкавы стаканчык. Мне ўжо стала нават цікава: які смак будзе мець гэтая вадкасць. Набраўшыся адвагі, я пакаштаваў "эліксір".


Фота: IREX/ProMedia

Не тое, каб змесціва «стакана» было ўжо зусім немагчымае для спажывання, ці яшчэ нешта такое, але ж па смаку "кава" нагадвала старажытны напой, прыгатаваны па сакрэтным рэцэпце алхімікаў, дэгустацыйныя асаблівасці якога можна знайсці ў фантастычных кнігах і з дапамогай якога чалавек мог атрымаць вечнае жыццё (калі, канешне, выжываў).

Што адбывалася далей - гісторыя зусім для іншага артыкула, а для сапраўдных аматараў добрай кавы я прапаную некалькі "хатніх" (г. зн. апрабаваных мною ў хатніх умовах) рэцэптаў прыгатавання кавы.

## «СТАНДАРТНАЯ» КАВА

1-2 чайныя лыжкі кавы на філіжанку вады. Давядзіце ваду да кіпення. Старанна апаласніце кіпнем кафейнік і пакладзіце ў яго палову падрыхтаванай порцыі парашку кавы. Заліце парашок кавы кіпенем і шчыльна закрыйце кафейнік. Хвіліны праз дзве засыпце астатнюю частку парашку кавы і даліце вады да неабходнай порцыі. Падаграявайце кафейнік на маленькім агню, але не даводзьце да кіпення. Праз пяць хвілін кава гатовая да спажывання.

## КЛАСІЧНЫ РЭЦЭПТ

1 порцыя. У маленькі кафейнік – джэзву (аб'ём 100 см$^3$) - кладуць 1 кавалак цукру, заліваюць свежай халоднай вадой і ставяць на агонь. Як толькі змесціва джэзвы закіпіць, кафейнік здымаюць з агню і засыпаюць 5-7 грамаў дробна молатай кавы. Перамяшаўшы лыжкай, ставяць на агонь і даводзяць да кіпення. Зняўшы з агню, дадаюць у джэзву вады і ставяць на агонь. Калі кава закіпіць, джэзву здымаюць з агню і ў гарачым выглядзе падаюць да стала. Пры неабходнасці ў каву дадаюць цукар.

## ПАЛАЮЧАЯ КАВА

Інгрыдыенты: 4 шклянкі вады; 60 гр. кавы; 80 гр. цукру; 80 гр. спірту або рому. Каву з цукрам засыпаюць ў кіпень, заварваюць і даюць час настаяцца. Разліваюць у кубкі. У палоўнік наліваюць спірт, запальваюць яго, пад час гарэння разліваюць ў кожную філіжанку і падаюць.

Адразу хачу абмовіцца, што ў мяне засталося яшчэ шмат добрых рэцэптаў кавы, так што заходзьце да нас у рэдакцыю - будзем частавацца!

**А. СТОГРАМОВІЧ**

*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (Ф. Багушэвіч)*

**ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР**

# ТРАВЕНЬ –

## 3 ТРАЎНЯ

Трэцяга траўня 1791 г. Сойм Рэчы Паспалітай зацвердзіў **Канстытуцыю** — першую ў Еўропе, другую ў свеце і апошнюю для супольнай дзяржавы Кароны і Літвы. Нашы продкі жылі паводле гэтай канстытуцыі да захопу беларускіх земляў Расейскай імперыяй. З таго часу шмат розных канстытуцый прашалясцела над галовамі беларускага народу, ды ўсе яны былі нейкія недаробленыя і не свае, таму доўга не жылі.

Сённяшняя канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, «падпраўленая» Лукашэнкам на рэферэндуме 1996 года, таксама далёкая ад дасканаласці і ад той краіны, якой быццам бы служыць. Шмат хто ў нас гэта разумее, але зрабіць нічога не можа. Усё адно, што з дажджом змагацца.

## 8 ТРАЎНЯ



Восьмага траўня 1999 г. знік **Юры Захаранка.** Дзяржаўныя органы за гэты час не прасунуліся ні на крок у росшуку былога міністра ўнутраных справаў, а пасля аднаго з лідэраў апазіцыі. Жонка Захаранкі перакананая, што яе мужа самым брутальным чынам забілі паплечнікі Лукашэнкі. А на гэтым здымку ён яшчэ побач з Віктарам Шэйманам, сённяшнім генеральным пракурорам Беларусі.

## 15 ТРАЎНЯ

15 траўня ў 1882 г. нарадзіўся беларускі акцёр і драматург **Уладзіслаў Галубок**. Яго імя добра вядомае ў культурным асяроддзі беларусаў, асабліва сярод дзеячоў беларускай сцэны. З дзіцячых гадоў ён прабіваў сабе шлях да святла, ведаў, культуры. “У 1896 г. за грошы, зробленыя на выгрузцы дроў, я набыў білет на галёрку менскага тэатра. Там і ўзнікла ў мяне думка стаць артыстам...” – расказваў сам Галубок. І ён стаў артыстам, драматургам, арганізатарам вандроўнага тэатру, які з 1932 г. называўся Беларускім трэцім дзяржаўным тэатрам.



Вандроўны тэатр пабываў са сваімі спектаклямі ў самых розных кутках Беларусі. Галубок аднachасова выконваў абавязкі мастака-дэкаратара, музыканта-выканаўцы і рэжысёра. Аснову рэпертуару складалі яго п’есы: “Пан Сурынта”, “Ганка”, “Плытагоны”, “Пінская Мадонна”, “Васіль Хмель”, у якіх раскрываецца барацьба беларускага народа за права “людзьмі звацца”. Тэатр Галубка карыстаўся выключнай папулярнасцю ў гледачоў.

Ул. Галубок любіў жыццё і людзей, быў сам узнагароджаны ўсенароднай любоўю. Нездарма ён – першы артыст БССР.

А вось лёс яго быў тыповым для нацыянальных дзеячоў Беларусі. Адхілены ад усіх пасадаў, у 1937 г. ён быў рэпрэсіраваны, і, паводле афіцыйнай версіі, памёр у няволі ад гіпертанічнай хваробы.

## 21 ТРАЎНЯ

21 траўня 1841 г. памёр **Юльян Нямцэвіч**, выдатны беларускі гісторык, пісьменнік і публіцыст. Нарадзіўся ён пад Берасцем, у маёнтку Скокі, скончыў Берасцейскі езуіцкі калегіум. Затым вучыўся ў кадэцкім корпусе ў Варшаве. У часе паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Касцюшкі стаў ягоным ад’ютантам. І разам жа з Тадэвушам Касцюшкам быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. І выйшлі яны з вязніцы разам. У 1796 г. Нямцэвіч быў паехаў у Амерыку, дзе жыў да 1807 г., потым зноў вярнуўся на Бацькаўшыну. Тут ён узяў удзел у паўстанні супраць расейцаў у 1831 г. Калі і гэтае паўстанне было задушанае, ён ад’ехаў у Францыю. Там жа і выйшлі ягоныя літаратурныя творы. Перадусім гэта раманы “Два паны Сяцехі” і “Ян з Тэнчына”, а таксама колькі камедыяў і патрыятычны паэтычны цыкл “Гістарычныя песні”. Пакінуў багата ўспамінаў, у якіх цікава і маляўніча апісаў Беларусь і яе гарады – Наваградак, Берасце, Горадню, Слонім ды іншыя. Вялікую дакументальную каштоўнасць уяўляюць сабою ягоныя “Літоўскія лісты”, напісаныя падчас вайны 1812 г.



21 траўня 1869 г. на Случчыне нарадзіўся **Канстанцін Валасовіч**, беларускі прыродазнаўца, геолаг, географ і хімік. Скончыў ён Варшаўскі універсітэт. Сярод ягоных навуковых подзвігаў ёсць і гэткі – ён збярог шкілет Ляхаўскага мамантa, аднаго з першых, што сталі вядомыя навуцы. Цяпер шкілет той захоўваецца ў Парыжы, у Французскім нацыянальным музеі прыроды. А наогул Канстанцін Валасовіч уважаецца за заснавальніка так званай чацвярцічнай геалогіі і палеаграфіі Паўночнай Еўразіі. Імем славутага беларускага навукоўца названыя выспы ў архіпелагу Паўночная Зямля, а таксама шэраг выкапнёвых жывёлаў ды раслінаў.

21 траўня 1894 г. на Браншчыне нарадзіўся **Мікалай Галадзед**, адзін з заснавальнікаў камуністычнай партыі ў Беларусі, савецкі дзяржаўны дзеяч. Удзельнічаў у расейскай рэвалюцыі 1917г. і грамадзянскай вайне. Быў другім сакратаром Кампарытыі Беларусі. Ад траўня 1927 г. і да траўня 1937-га, роўна 10 гадоў, узначальваў ён Савет Народных Камісараў БССР. Апарат кіравання кампартыі стаўся часткаю дзяржаўнага апарату, якая вызначала асноўныя кірункі дзяржаўнага развіцця і кантралявала іх выкананне. Менавіта ў гэтым і палягала «кіраўнічая роля» партыі, бо шэраговыя камуністы ніяк не ўплывалі ні на партыйную, ні на дзяржаўную палітыку. Мікалай Галадзед быў арыштаваны НКВД у Маскве і падчас допыту ў Менску выкінуўся з акна на вуліцу. У гэты самы дзень.



У выніку камуністычных рэпрэсіяў у 1937-1938 гг. Беларусь была «ачышчана» ад «контррэвалюцыйных элементаў і шпіёнаў». Толькі пры «выкрыцці» гэтак званага «Аб`яднанага антысавецкага падполля» асуджана больш за 2,5 тысячы чалавек, значная частка з іх расстраляна. У 1937-1938 гадах праводзілася масавая акцыя «па выкрыцці» польскіх, нямецкіх і латышскіх «шпіёнаў». Было арыштавана каля 23,5 тысяч чалавек, больш як 21 тысяча з іх расстраляна. Рэпрэсіі 1938 года закранулі ўсе пласты грамадства, у тым ліку і арганізатараў гэтых рэпрэсіяў. Былі арыштаваныя 99 сакратароў райкамаў КПБ са 101, больш за 50 старшыняў райвыканкамаў, сакратары ЦК КПБ. Выглядае, што стваральнікі апарату гвалту ў Беларусі самі ж і сталі яго ахвярамі. Адным з такіх быў Мікалай Галадзед.

## 22 ТРАЎНЯ

22 траўня 1863 г. адбылася бітва пад **Мілавідамі** паміж беларускімі паўстанцамі і расейскімі карнікамі. Мілавідская бітва ўвайшла ў гісторыю паўстання Кастуся Каліноўскага як адна з самых вялікіх. Тады тут загінула і было паранена блізу 50 паўстанцаў, а расейцы згубілі ўдвая болей жаўнераў і мусілі адступіць. Напярэдадні гэтай падзеі ў навакольных лясах сыйшлося немалое паўстанцкае войска, якое складалася са Слонімскага, Гарадзенскага, Наваградскага і Пружанскага атрадаў, агулам блізу 800 чалавек. 20 траўня паўстанцкі лагер інспектаваў сам Кастусь Каліноўскі. Нягледзячы на тое, што ў расейцаў была значная перавага ў колькасці і ў зброі, яны былі разбітыя і змушаныя адступіць. Наступнай раніцай на дапамогу расейскаму палку былі пасланыя з Нясвіжа яшчэ дзве роты, але паўстанцы сыйшлі ў лясы, забраўшы сваіх параненых і забітых таварышаў...

Паўстанне 1863 года было наогул з нешматлікіх у гісторыі XIX стагоддзя прыкладаў, калі, па-сутнасці, купка ўзброеных людзей, абараняючы сваю чалавечую і нацыянальную годнасць, паўстала супраць велізарнай імперыі. У 1930 г. на месцы бою пад Мілавідамі была пастаўленая мемарыяльная капліца, што стаіць там і цяпер. Напэўна сёння там будуць пакладзеныя жывыя кветкі. Вечная памяць героям!



22 траўня 1900 г. у маёнтку Ізабэлёва пад Пухавічамі нарадзіўся **Мікола Касяровіч,** выдатны беларускі этнограф, мовазнаўца, даследчык літаратуры. ¨н скончыў Менскі інстытут народнай асветы ў 1921г. Ад 1926-га працаваў на пасадзе навуковага сакратара Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры і сакратаром краязнаўчага часопіса “Наш край”. ¨н напісаў і выдаў агулам больш за 230 навуковых працаў па розных тэмах. У абсягі ягоных інтарэсаў траплялі пытанні мастацтвазнаўства, літаратуры, тэатру, краязнаўства, філалогіі ды асветы.

Выдаў Мікола Каспяровіч і некалькі слоўнікаў

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# СОНЦАМ САГРЭТЫЯ ДНІ

беларускай мовы. Але большасць ягоных навуковых працаў, што гэтак і засталіся ў рукапісах, была знішчаная камуністамі пасля ягонага арышту.

«Гульня ў незалежнасць», якую бальшавікі выкарысталі для ўтрымання ўлады ў нацыянальных рэспубліках, скончылася. У канцы 1929 - пачатку 30-х гадоў найбольш актыўныя дзеячы беларусізацыі былі выключаныя з партыі, а пасля – арыштаваныя. І хоць палітыка беларусізацыі не была адмененая, выконваць яе цяпер трэба было шляхам «інтэрнацыянальнага выхавання». У 30-я гады змянілася і канцэпцыя нацыянальнай палітыкі. Было канстатавана, што расейцы дапамаглі адсталым народам і цяпер з'яўляюцца для іх «старэйшымі братамі». «Расейскае» і «савецкае» робяцца сінонімамі, расейская культура - перадавой, расейская гісторыя - гераічнай. Арыштавалі Міколу Касяровіча яшчэ ў 1930-м годзе і зняволілі на 5 гадоў. Пасля турмы ён мусіў жыць у выгнанні ажно ў Новасібірску, дзе давялося яму выкладаць расейскую мову. Але і там яго не пакінулі ў спакоі маскоўскія каты. У 1937-м ён быў арыштаваны паўторна і расстраляны.

## 23 ТРАЎНЯ

23 траўня 1946 г. пакінуў наш свет **Кастусь Езавітаў** — выбітны беларускі палітычны і грамадскі дзеяч.

А нарадзіўся ён у 1893 г. у Дзвінску. Скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут і Паўлаўскую вайсковую вучэльню. Яшчэ ў 1913 г. Езавітаў стаў сябрам Беларускай Сацыялістычнай Грамады. У першую Сусветную вайну праводзіў актыўную работу сярод жаўнераў-беларусаў Паўночнага фронту. За ўдзел у працы Першага Усебеларускага кангрэсу і дзейнасць дзеля стварэння беларускага войска ў студзені 1918 г. быў арыштаваны бальшавікамі, але здолеў уцячы з астрогу. 25 сакавіка 1918 г. Кастусь Езавітаў удзельнічаў у абвяшчэнні незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, увайходзіў у склад яе Рады як міністр абароны. Затым ён быў кіраўніком Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Латвіі ды Эстоніі. Наладзіў дыпламатычныя дачыненні беларускага ўраду з урадамі Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі ды Фінляндыі, звяртаўся з просьбай аб вайсковай дапамозе да ўраду ЗША. У траўні 1920 г. «за выдатную працу на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі» атрымаў званне генерал-маёра. У 1921-1944 гг. жыў у Латвіі. ¨н быў тут намеснікам старшыні таварыства «Бацькаўшчына» ў Латгаліі, узначальваў беларускае выдавецтва, таварыствы беларусаў-выбаршчыкаў, беларускіх настаўнікаў, навукова-краязнаўчае. Браў удзел у Пражскай і Берлінскай палітычных канферэнцыях. Рэдагаваў газету «Голас беларуса» і часопіс «Беларуская школа ў Латвіі».



За сваю нацыянальную працу чатыры разы арыштоўваўся латвійскімі ўладамі. Выпрабаванні лёсу не змусілі мужнага генерала здрадзіць абраным ідэалам. У Другую Сусветную вайну ён знаходзіўся сярод тых, хто спрабаваў выкарыстаць барацьбу імперыяў-монстраў дзеля адраджэння сапраўды незалежнай беларускай дзяржавы. Езавітаў быў схоплены савецкай вайсковай контрразведкай у красавіку 1945 г. Паводле афіцыйнай версіі, памёр ад сухотаў 23 траўня 1946 г. падчас следства. Насамрэч яго пасля жорсткіх катаванняў расстралялі. Кастусь Езавітаў напісаў шэраг кніг і артыкулаў па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху, беларусазнаўству, ён аўтар арыгінальных пачуццёвых вершаў, укладальнік школьных дапаможнікаў. Меў багаты кнігазбор, падрыхтаваў да друку невядомыя раней творы Максіма Багдановіча.

23 траўня 1980 г. памерла **Ларыса Александроўская**, слынная беларуская оперная спявачка і рэжысёрка. народная артыстка Беларусі. Незвычайная мастацкая адоранасць, цудоўны голас сапрана і драматычны тэмперамент абумовілі яе вялікі поспех. Не толькі на сцэне. Ларыса Александроўская заслужыла сапраўдную ўсенародную любоў. Пасля яе смерці, з 1987 г. ў Беларусі праводзяцца нацыянальныя конкурсы вакалістаў імя Александроўскай, а ў 1992-м яе імя нададзена прэміям у галіне тэатральнага мастацтва...

## 24 ТРАЎНЯ

24 траўня – Дзень славянскага пісьменства і культуры.



24 траўня 1173 года памерла **Ефрасіння Полацкая**. Яна прыйшла на свет на пачатку XII ст. у Полацку, у сям'і князя Святаслава-Георгія і даводзілася ўнучкай найслаўвуцейшаму з полацкіх валадароў - Усяславу Чарадзею. Дзяўчынку назвалі старажытным полацкім імем Прадслава. Слава пра розум і прыгажосць полацкай князёўны разнеслася далёка. Калі Прадславе споўнілася дванаццаць гадоў (у такім веку дзяўчынка ўжо лічылася тады нявестаю), у Полацак зачасцілі сваты. Бацькі меркавалі выдаць князёўну замуж за сына нейкага слаўнага сваім багаццем і княжаннем уладара. Аднак Прадслава абрала сабе іншы шлях: пастанавіўшы стаць Хрыстоваю нявестаю, яна прыйшла ў манастыр і прыняла пастрыг пад імем Ефрасінні. Спачатку маладая манашка пасялілася ў келлі Сафійскага сабору. Праз колькі гадоў духоўнага ўдасканалення яна заснавала ў Полацку жаночы, а затым і мужчынскі манастыры. Пры іх Ефрасіння адчыніла скрыпторыумы - майстэрні перапісвання кніг, а таксама школы, у якіх дзеці авалодвалі граматай, вучылі гісторыю, грэцкую і лацінскую мовы, спасцігалі навуку красамоўства. Па яе замове полацкі дойлід Ян пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, а ювелір Богша (хрысціянскае імя Лазар) стварыў крыж - бясцэнную святыню беларусаў. Унучка Усяслава Чарадзея ўздымала свой голас супраць княжаскіх міжусобіц, папярэджвала, што братазабойчыя войны могуць прывесці Бацькаўшчыну да гібелі. На схіле жыцця Ефрасіння вырашыла здзейсніць духоўны вычын – паломніцтва ў Святую Зямлю.

24 траўня 1542 г. **Станіслаў Давойна** стаў полацкім ваяводам. Гэта быў надзвычай цікавы персанаж нашай гісторыі. У 1563-м ён кіраваў абаронаю свайго Полацка ад войскаў маскоўскага цара Івана Жахлівага. Абаронцы гораду маглі б вытрымаць доўгую аблогу, каб не памылкі полацкага ваяводы Станіслава Давойны. Першы раз ён памыліўся, выправіўшы з гораду, каб паменшыць колькасць едакоў, дзве тысячы сялянаў, што ўмацоўвалі сцены. Царскія людзі палавілі іх і прымусілі паказаць лясныя ямы з гарадскімі запасамі збожжа. Другі раз Давойна схібіў, калі адвёў абаронцаў у замак і падпаліў астрог з пасадамі. Пад прыкрыццём густога дыму стральцы ўварваліся ў места і перацягнулі туды гарматы. Цар расейскі дэклараваў пакінуць абаронцам Полацка волю і маёмасць. Ваявода Давойна, забыўшыся, што дзяржаўнага слова ў Маскоўшчыне ніколі не трымалі, выступіў з фартэцы з усім войскам і артылерыяй. Пасмяяўшыся з веры палачанаў у ягоныя абяцанні, цар Іван Жахлівы акружыў палонных моцнай аховаю і загадаў пяць дзён не даваць ім есці. Полацак быў знішчаны дашчэнту.

## 27 ТРАЎНЯ



27 траўня 1900 г. у вёсцы Макашы, што раскінулася над ракой Вушой, непадалёк ад чыгуначнай станцыі Гарадзея, нарадзіўся **Уладзімір Жылка**, выдатны беларускі паэт. У Менску працаваў літсупрацоўнікам у «Звяздзе», перакладчыкам на Белдзяржкіно, выкладчыкам у музычным тэхнікуме. Пры газеце, дзякуючы Жылку, пачынаюць гуртавацца маладыя таленавітыя пісьменнікі, перыядычна з'яўляецца літаратурная старонка. На Белдзяржкіно паэт перакладае фільмы на беларускую мову.

Уладзіміра Жылку арыштавалі 18 ліпеня 1930 года. ¨н адмовіўся падпісаць акт абвінавачвання аб сваёй прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі. Пасля медычнага агляду чэкістам стала зразумела - у турэмных умовах падследны можа не дажыць да абвяшчэння прысуду. Праз месяц пасля арышту Жылку вызваляюць з-пад варты. На волі паэту пабыць давялося нядоўга. Неўзабаве яго зноў арыштавалі і 10 сакавіка 1931 года абвясцілі судовы вырак - пяць гадоў высылкі ў горад Уржум Кіраўскай вобласці. Адсюль ён ужо не вярнуўся. 1 сакавіка 1933 года паэт памёр. Памятаеце ягоныя радкі:

Калі сябры нас губяць згубаю<br>
І ворагі прарочаць скон<br>
Тады к Табе, о Вільня любая,<br>
прыводзяць згадкі у палон...

Падхапіўшы Луцкевічаву метафару пра Вільню як Меку, а Менск, як Медыну, Жылка гукаў да паходу. У гэтай метафары ёсць яшчэ адзін неабходны персанаж — постаць Прарока. Яго прагна імкнуўся разгледзець паэт:

"Між тых, хто ўцяклі да Медыны,<br>
Ці бачыш, ці бачыш яго?"

Прарок не прыйшоў. Але паэтава прароцтва, як і прароцтва Луцкевіча, засталося. За тыя гады, што прамінулі, нішто не замяніла беларусаў Вільні. І нішто не адменіць тых прароцтваў.

**ГІСТАРЫЧНЫ СЕКТАР**

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

### ПРЫВІТАННЕ ,"ДЗЕДЗІЧ"!

*Некаторы час таму атрымаў ад свайго сябра вашу газету. Адразу ж дзякую Вам за "Дзедзіч" - гэта тое, што я шукаў вельмі доўга. "Дзедзіч" мне вельмі спадабаўся, таму як гэта сапраўдная беларуская газета.*

*Я даўно пачаў слухаць беларускі рок і зразумеў, што гэта самая цудоўная музыка. Мне вельмі падабаюцца такія гурты, як NRM, КРЫВІ, ПАЛАЦ, а вельмі, вельмі, вельмі моцна мне падабаюцца гурты "БЕЗ НАЗВЫ" і "ПРАЕКТ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ".*

*Я лічу, што гэтыя ўсе гурты па-сапраўднаму беларускія, таму што мова, на якой яны спяваюць – беларуская, у песнях сваіх яны гавораць нам аб шчырай і светлай любові да сваёй Радзімы, да людзей, да прыроды.*

*Я буду вельмі ўдзячны Вам за інфармацыю. Толькі праз вашу газету моладзь пабачыць прыгажосць Беларусі, таму што ў "Дзедзіча" светлая будучыня.*

*Дзякуй за ўсё!*

***Ваш чытач Сяргей Ючык***
***Кобрынскі р-н, в. Яронічы.***

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Шаноўны Сяржук. Нам вельмі прыемна, што справа, якой мы аддаем большую частку свайго вольнага часу, не застаецца незапатрабаванай.

Укладаючы шматлікія намаганні ў справу папулярызацыі нашай роднай мовы, мы імкнемся да пашырэння ведаў аб нацыянальнай культуры, традыцыях і самабытных рысах беларусаў і Беларусі ў цэлым. Да спісу гэтых нацыянальных здабыткаў трэба, безумоўна, аднесці і музыку.

Новая беларуская музыка займае асобнае месца сярод музычных субкультур Еўропы. Не сакрэт, што такія гурты, як N.R.M., Крама, Новае Неба, Крыві, Палац, Нейра-дзюбель, Камэлот і шмат іншых вядомыя далёка па-за межамі Рэспублікі Беларусь.

Апошнім часам у поўны голас аб сабе пачалі казаць маладыя гурты, такія як: Сьцяна, ONEGIN, БН і шмат іншых калектываў, якія маюць свой асобны, адметны стыль.

Пра ўсе гэтыя калектывы і іх творчасць мы абавязкова паспрабуем расказаць у далейшых нумарах.

# «К НАМ ЕДЗЕТ N.R.M.»

УРЫЎКАМ З АДНАГО ДЫЯЛОГА, РАЗМЕШЧАНАГА Ў АДНЫМ З АПОШНІХ АЛЬБОМАЎ, ХАЦЕЛАСЯ Б РАСПАЧАЦЬ ДАДЗЕНЫ АРТЫКУЛ, ПРЫСВЕЧАНЫ АГЛЯДУ ТВОРЧАСЦІ І ПРЭЗЕНТАЦЫІ НОВАГА АЛЬБОМУ ГУРТА N.R.M. "ДОМ КУЛЬТУРЫ".

На пачатку хацелася б паспрабаваць зрабіць невялічкі агляд мінулых дасягненняў музыкаў.

Па-большасці гурт N.R.M. з'яўляецца рэінкарнацыяй легендарнага гурта "Мроя". Пасля піка папулярнасці ў 1989-1990 гг. справы гурта пайшлі па зыходзячай. Тады музыкі па ініцыятыве Лявона Вольскага вырашылі змяніць стылістыку, а каб не ціснула назва, яе змянілі на N.R.M. ("Незалежная Рэспубліка Мроя"). У выніку, ад хард-рока гурт адышоў у бок гранджу і іншага альтэрнатыўнага року пачатку 90-х гг.



Напрыканцы 1994 г. пачаліся актыўныя рэпетыцыі новага матэрыялу і ў 1995 г. пры дапамозе Вячаслава Корня, лідэра гурта "Уліс", быў запісаны дэбютны альбом пад назваю "LaLaLaLa". Змена стылістыкі і назвы адразу дала станоўчыя вынікі, асабліва ў спалучэнні з яскравай антытаталітарнай ідэалогіяй, якая яшчэ ярчэй была выяўлена ў другім альбоме "Одзірыдзідзіна". Вынікам новага музычнага напрамку, абранага музыкамі, з'явілася "Вялікая карона" на "Рок-каранацыі '97" у студзені 1998 г. Далей былі альбомы "Пашпарт грамадзяніна N.R.M." (1999 г.) і двайны альбом з запісамі акустычных канцэртаў гурта ("Акустычныя канцэрты канца XX стагоддзя"). Восенню 2000 г. выйшаў альбом пад назвай "Тры чарапахі", які пабіў усе рэкорды па продажах сярод беларускіх рок-альбомаў і ў выніку чаго гурт атрымаў "Рок-карону 2000" і шэраг іншых прызоў.

У 2002 г. быў запісаны кавер песні "Personal Jesus" (у выкананні гурта - "Твой Езус") для беларускага трэб'юта Depeche Mode "Personal Depeche", які пабачыў свет 14 снежня 2002 г.

24 студзеня 2003 кампанія West Records выпусціла новы альбом каманды N.R.M. "Дом культуры". Дыск выйшаў у дзвюх версіях - дарагі (з дыялогамі і відэафільмам) і танны (толькі песні). Як адзначаюць самі музыкі, сапраўдны прыхільнік гурта набудзе дзве версіі.

Падобна да гогалеўскага "Рэвізора", новы альбом пачынаецца са слоў дырэктара ¨цавіцкага дома культуры (дарэчы на чыстай і правільнай трасянцы): "Я прышла саабшчыць вам прэнепрэятнейшае ізвесьціе: к нам едзет N.R.M." Вось з гэтай падзеі і пачынаецца "завязка" альбома. Кожная музычная кампазіцыя чаргуецца з дыялогавай рэплікай героЯў музычнага альбому. Трэба адзначыць, што падобная кампазіцыйная пабудова для гурта не новая.

Нешта тоеснае было выкарыстана пры стварэнні альбому "Тры чарапахі" (восень 2002 г.), калі паміж музычнымі трэкамі былі размешчаны гумарыстычныя дыялогі. Але наватарскім у новым альбоме музыкаў можна назваць тое, што дыялогі набылі лагічную звязанасць і сэнсавую закончанасць.

Як ужо адзначалася вышэй, альбом пачынаецца з маналогу дырэктара дома культуры, якая ўсхваляваная прыездам беларускамоўнага гурта. З гэтага моманту пачынаецца "супрацьстаянне" з аднаго боку новай беларускай музыкі і яе прыхільнікаў (кіраўнік тэатральнага гуртка ¨цавіцкага Дома культуры) і з другога – людзей, якіх палохае музыка з беларускімі словамі.

Ну, а як далей будуць развівацца падзеі, казаць вам не буду, каб цікавей было слухаць альбом. Так што купляйце і слухайце.

**Сымон МУЗЫКА**

**P.S.**

А калі няма грошаў, каб набыць CD або касетку, або Вы жадаеце прыемна правесці вольны час – прыходзьце да нас. Будзем слухаць разам!

# «МУЗЫЧНЫЯ ДАЖЫНКІ-2002»

АБ ЗАКАНЧЭННІ ЧАРГОВАГА МУЗЫЧНАГА ГОДУ Ў ЖЫЦЦІ МУЗЫКАЎ І ГРАМАДСТВА, ЗАЦІКАЎЛЕНАГА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКАЙ, СВЕДЧЫЦЬ «РОК-КАРАНАЦЫЯ 2002». «КАРАНАВАННЕ» АДБЫВАЛАСЯ ПА 7 АСНОЎНЫХ НАМІНАЦЫЯХ І 4 НАМІНАЦЫЯХ ДАДАТКОВЫХ. У БОЛЬШАСЦІ ВЫНІКІ «МУЗЫЧНЫХ ДАЖЫНАК» МОЖНА БЫЛО ПРАДБАЧЫЦЬ, ТАМУ ЯК УЗНАГАРОДАМ ПАПЯРЭДНІЧАЛА РУПЛІВАЯ ПРАЦА ВЫКАНАЎЦАЎ І ЛЮДЗЕЙ, ДЗЕЙНАСЦЬ ЯКІХ ЗВЯЗАНА З МУЗЫКАЙ.

**Асноўныя намінацыі (па галасаванні агульнага журы):**

ВЫКАНАЎЦА ГОДУ - Крамбамбуля.
АЛЬБОМ ГОДУ - Крамбамбуля "Крамбамбуля".
ПРАДЗЮСЕР ГОДУ - А. Страповіч /А. Халадзінскі/ Р. Макараў за праект "Personal Depeche - Беларускі трэб'ют Depeche Mode".
ПЕСНЯ ГОДУ - Крамбамбуля "Абсэнт".
АДКРЫЦЦ¨ ГОДУ - Лялькі.
КЛІП ГОДУ - Ляпіс Трубецкі "Юнацтва" (рэжысёр Ігар Пашкевіч).
ПАДЗЕЯ ГОДУ - адкрыццё "Першага музычнага".

**Спецыяльныя прызы (па галасаванні спецыялізаваных журы або прыватных рашэннях):**

ЛЕПШЫ РЭГІЯНАЛЬНЫ ВЫКАНАЎЦА (вызначаўся згодна з рашэннем двух рэгіянальных экспертаў і "вузкага" журы музычных журналістаў) - Rasta (г. Гомель).
МУЗЫЧНЫ САЙТ ГОДУ (вызначаўся па галасаванні вядучых музычных журналістаў) - неафіцыйны сайт групы Песняры (www.pesnyary.com). Аўтар - Ф. Караленка.
ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ (прыватны прыз кампаніі Dainova) - Стары Ольса.
САУНДПРАДЗЮСЕР ГОДУ (прыватны прыз па ініцыятыве музыкаў) - Генадзь Сыракваш.

**Сымон МУЗЫКА**

## ДАРЭЧЫ

Нябожчыка хавалі з музыкай і хорам. Вырашыўшы, што апошняе зрабілі дарэмна, хор адкапалі.

***

Навіна: Перадача «Фабрыка зорак» атрымала дзяржаўную прэмію «Лепшы перадавік» за ўздым фанернай прамысловасці.

***

- Што гэта за жудасны вой на балоце, Ватсан?
- Гэта сабака Баскаў, Холмс.

***

- Як правільна пасадзіць гасцей?
- Трэба ўсё уважліва слухаць і запісываць...

***

Юбілейная вечарына ветэранаў. Парадак дня:
1. Урачыстая частка.
2. Расстрэл здраднікаў.
3. Канцэрт.

***

... крэм ад маршчын «Avon»: мне семдзесят - а я выглядаю на ўсе сто...

# ТЭРМІНАТАР 3: ПАЎСТАННЕ МАШЫН

НЕ ТАК ДАЎНО Ў САН-ДЫЕГА ПРАЙШОЎ КІНАФОРУМ, ДЗЕ БЫЛІ ПРАДСТАЎЛЕНЫ ЎРЫЎКІ З ФІЛЬМУ "ТЭРМІНАТАР 3: ПАЎСТАННЕ МАШЫН". ПАСЛЯ ГЭТАЙ ПАДЗЕІ РЭЖЫСЁР ФІЛЬМА ДЖОНАТАН МОСТАЎ РАЗАМ З АРНОЛЬДАМ ШВАРЦНЭГЕРАМ ДАЛІ НЕВЯЛІЧКАЕ ІНТЭРВ'Ю. ПА ВЫНІКАХ ПРЭСАВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ СКЛАЛАСЯ АГУЛЬНАЕ ЎЯЎЛЕННЕ ПРА ЧАРГОВУЮ ГІСТОРЫЮ АБ МАГЧЫМЫМ ДРАМАТЫЧНЫМ ЛЁСЕ ЧАЛАВЕЦТВА.

Адразу трэба адзначыць, што ў эпапеі аб непаслухмяных машынах змяніўся рэжысёр: трэцюю частку сагі аб тэрмінатары здымаў Джон Мостаў (для тых, хто ўжо паспеў забыць імя і прозвішча рэжысёра першай і другой часткі нагадаем, што ім з'яўляўся Джэймс Кэмеран). У падтрымку Мостава можна сказаць наступнае: рэжысёр і сцэнарыст пачаў сваю кар'еру ў кіно будучы яшчэ студэнтам Гарварду. Першым ігравым фільмам быў "Палёт чорнага анёла". Сярод рэжысёрскіх прац можна ўзгадаць наступныя фільмы: "Аварыя" - 1997 г. (трылер), "Падводная лодка U-571" - 2000 г. (трылер), "Тэрмінатар 3: Паўстанне машын" (фантастычны баявік).



Джон Мостаў

Сам Джон Мостаў аб сваёй новай рэжысёрскай працы выказаўся наступным чынам: "Калі я працаваў над сваімі папярэднімі фільмамі, я заўжды думаў аб тым, ці прыйдзе нехта паглядзець у кіназал на маю творчасць. А што датычыцца гэтага фільму, добра гэта ці дрэнна не ведаю, але ўсе пойдуць на гэты фільм. І нават тыя, хто кажа, што мы ўсё сапсуем, усё роўна прыйдуць паглядзець на гэты фільм. І мне, як рэжысёру, гэта вельмі дапамагае, бо я ведаю аб тым, што ў нас будзе аўдыторыя."

Са слоў Арнольда Шварцнэгера вынікае, што ў фільм была ўкладзена даволі такі значная сума грошаў, што дае права разлічваць на пэўную колькасць якасных спецэфектаў і добрае відовішча. Шмат гледачоў ужо даўно чакаюць на працяг фільма і іх не хвалюе тое, што другая частка выйшла на экраны дзесяць год таму. У сувязі з гэтым узнікае "невялічкая" недарэчнасць: калі герой Шварцнэгера перамяшчаецца з будучыні ў мінулае, ён вымушаны прадстаць перад вачыма гледачоў у аголеным выглядзе. Усё было б не так дрэнна, калі б Арнольд Шварцнэгер, як, дарэчы, і ўсе людзі, не састарэў з моманту выхаду другой часткі "Тэрмінатара". А паколькі розніца ў дзеяннях паміж другой і трэцяй часткай складае ўсяго некалькі год, то Шварцнэгер павінен быць у добрай фізічнай форме. Сам кінаакцёр пракаментаваў гэтую падзею так: "Паколькі я з'яўляюся ў аголеным выглядзе, цела павінна быць такім жа, як і ў двух папярэдніх фільмах. У іншым выпадку я не буду тым жа робатам. І ў сувязі з гэтым апошнія шэсць месяцаў я праводжу ў напружаных трэнероўках".



Фота са здымачнай пляцоўкі

Што датычыцца сцэнара, то падрабязнасці сюжэта трымаюцца ў таямніцы. З роліка вядома толькі адно: адмоўным героем (або адным з адмоўных герояў) будзе жанчына. Застаецца спадзявацца толькі на тое, што Дабро (у постаці А. Шварцнэгера) пераможа чарговае Зло.

Прэм'ера фільма пройдзе ў Штатах 2 ліпеня.

**ICE**

# ЛЕГЕНДА АБ АНАСТАСІІ СЛУЦКАЙ

ПРАЦА ПА АГУЧВАННІ ФІЛЬМА БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ У ПРАЗЕ ДА СЯРЭДЗІНЫ ТРАЎНЯ. БЕЛАРУСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ АДПРАВІЛАСЯ З ГЭТАЙ МЭТАЙ Ў СТАЛІЦУ ЧЭХІІ 21 КРАСАВІКА.

Аб гэтым паведаміў загадчык кіравання кінавідэамастацтвам Міністэрства культуры Беларусі Уладзімір Купрыенка. У Празе, паведаміў ён, была абрана адна з кампаній, якая займаецца агучваннем фільмаў у сістэме "Долбі-стэрэа". Нацыянальны праект - фільм "Легенда аб Анастасіі Слуцкай" - будзе першай мастацкай стужкай гэтага сучаснага стандарту.

Плануецца, што цалкам праца па агучванні стужкі скончыцца да пачатку траўня. Такую мэту паставіў перад яе стваральнікамі і міністр культуры Беларусі Леанід Гуляка.

Нагадаем, што прэм'ера фільма Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" рэжысёра Юрыя Елхава "Анастасія Слуцкая" запланавана на 3 ліпеня 2003 года. Гэта падзея прымеркавана да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

**Паводле БЕЛТА**

## ДАРЭЧЫ

Сядзіць мужык, тэлевізар глядзіць. Да яго падыходзіць сын 7 гадоў:

- Тата, а чаму гэты фільм нельга дзецям глядзець?

- Цішэй сядзі... зараз сам пабачыш!

***

Я чуў, ваша жонка рэжысёр?

- Так.

- А дзе і над чым, калі не сакрэт, яна зараз працуе?

- Яна працуе дома, рэжысёрам сямейных сцэн.

***

Некаторыя з тых, хто пакутуе на кашаль, ідуць да доктара. Астатнія ідуць у тэатр.

***

Глядзіце ў лепшых кінатэатрах краіны! Новы фільм жахаў: «Радыён Раскольнікаў у доме састарэлых».

Толькі сёння! Прэм'ера фільма: "Вайна фарматаў". У галоўных ролях: Памэла Андэрсан і Крысціна Арбакайтэ.

## СМАЧНА ЕСЦІ!

# БАБУЛЬЧЫНЫ ПРЫСМАКІ

СВЯТА ЎСІХ ХРЫСЦІЯН - ВЯЛІКДЗЕНЬ - ЗАНЯЛО СВАЁ ПАЧЭСНАЕ МЕСЦА Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І ІНШЫХ НАРОДАЎ СВЕТУ. І НЯМА РОЗНІЦЫ, ДА ЯКОГА АДГАЛІНАВАННЯ ТЫ АДНОСІШСЯ - КАТАЛІК ЦІ ГРЭКА-КАТАЛІК, АЛЕ ВЯЛІКДЗЕНЬ ДЛЯ КОЖНАГА З'ЯЎЛЯЕЦЦА АДНЫМ З ГАЛОЎНЫХ СВЯТОЧНЫХ ДЗЁН У РЭЛІГІЙНЫМ КАЛЕНДАРЫ.

Па традыцыі Вялікадню папярэднічае пост, пасля якога дазвалялася есці не скаромныя стравы. Вядома, сучасная беларуская кухня вельмі адрозніваецца ад старажытнай. З'явіліся новыя прадукты, змяніліся ўмовы жыцця.

Але кулінарныя прыхільнасці беларусаў, асабліва на вёсцы, захоўваюць нацыянальную самабытнасць.

Гаспадыні яшчэ памятаюць і ўжываюць бабуліны рэцэпты разнастайных поліваак, запяканак, бліноў, аладак.

А для тых, хто не мае магчымасці даведацца аб старажытнабеларускіх рэцэптах прыгатавання вышэйзгаданых страў, прапануем дастаць хатнюю кулінарную кнігу і як мага хутчэй запісаць наступныя рэцэпты.

### ПОЛІЎКА БЕЛАРУСКАЯ

50 г жытняга хлеба, 25 г сушаных грыбоў, 1 морквіна, 1 цыбуліна, 1 ст. лыжка тлушчу, 1 ч. лыжка тамату-пюрэ, 1,2 л мяснога булёну, 0,5 шклянкі смятаны, соль.

Загадзя замочаныя грыбы адварыць, булён працадзіць праз складзеную ўдвая тканіну, грыбы нашаткаваць. Жытні хлеб нарэзаць лустачкамі, падсушыць у духоўцы, змяльчыць, заліць невялікай колькасцю гарачага булёну, накрыць, пачакаць, пакуль астыне. Пасля гэтага хлебную масу працерці праз сіта, змяшаць з рэштай мяснога булёну, уліць грыбны адвар.

Абсмажыць на тлушчы дробна парэзаныя моркву і цыбулю разам з таматам-пюрэ, пакласці ў булён, які кіпіць. Дадаць падрыхтаваныя грыбы, соль, варыць 7-10 хвілін.

Падаць поліўку са смятанай.

### ЗАПЯКАНКА З БУЛЬБЫ І ГРЫБОЎ

1 кг бульбы, 300 г свежых грыбоў, 60 г топленага масла, 1,5 шклянкі малака, 2 яйкі, 1-2 цыбуліны, соль, кмен.

Бульбу зварыць, абабраць, нарэзаць тонкімі скрылькамі. Свежыя грыбы (можна выкарыстаць і сушаныя) адварыць, нарэзаць саломкай, абсмажыць разам з нашаткаванай цыбуляй, дадаць кмен. У глыбокую патэльню, змазаную маслам, выкласці слаямі бульбу і грыбы. Верхні і ніжні слаі павінны быць з бульбы. Заліць малаком, змешаным з яйкамі і соллю, запячы ў духоўцы.

### АЛАДКІ З ЯБЛЫКАМІ

2 шклянкі мукі, 2-3 яблыкі, 0,75 шклянкі кіслага малака (кефіру), 1 яйка, 1 ст. лыжка цукру, алей для смажання, 0,5 ч. лыжкі соды, соль.

Яблыкі (разам са скуркай) змяльчыць на буйной тарцы, дадаць яйка, цукар, кіслае малако, соду, муку, добра вымешаць. Лыжкай выкладваць цеста на добра разагрэтую патэльню з алеем. Абсмажваць аладкі з абодвух бакоў.

**Андрусь ЛЯЎЧУК**

# СИНТЕТИЧЕСКИЕ ЛЕСА НА ЗЕМЛЕ?..

ИЗОБРЕТЕНО ИСКУССТВЕННОЕ ДЕРЕВО, КОТОРОЕ МОЖЕТ ЗАМЕНИТЬ ЖИВЫЕ РАСТЕНИЯ, НО ВНЕШНЕ ОНО НИКАК НЕ ПОХОЖЕ НА НИХ.

По словам автора изобретения, физика из Колумбийского университета Клауса Лакнера, искусственное дерево выглядит как "стойка ворот с жалюзи". Новые деревья будут абсорбировать углекислоту из воздуха как настоящие растения в ходе фотосинтеза, сохранять углерод, но не будут выделять кислород. В случае широкого распространения искусственные деревья будут в состоянии снизить содержание углекислоты в атмосфере, высокое содержание которой вызывает "парниковый эффект". По расчетам Лакнера, одно искусственное дерево может удалить 90 тысяч тонн углекислоты в год, что равнозначно выхлопам 15 тысяч машин.

Пока что искусственное дерево существует только на бумаге, но Лакнер готовится создать действующую модель. Он считает, что новая технология будет снижать содержание углерода, а поглощаемый углерод - складироваться. Как полагает Лакнер, самое дорогостоящее - переработка абсорбента, который будет быстро насыщаться углекислотой.

Искусственные деревья можно сажать всюду. Для поглощения 22 млрд. тонн углекислоты, глобально выделяемой ежегодно, понадобится 250 тысяч искусственных деревьев.

Вместе с тем у проекта есть и противники. Говард Херцог из Массачусетского технологического института считает, что на поглощение углекислоты уйдет больше энергии, чем сберегает подобная технология. "Идея поглощения из воздуха представляется весьма привлекательной, но нужно разделять концепцию и технические детали", - полагает он. Тем временем Клаус Лакнер выдвинул идею хранилища для углерода. Когда углекислота взаимодействует с магнием, образуются карбонатные породы, которые хорошо удерживают углерод в течение неопределенно долгого времени. Правда, пока этот процесс является весьма дорогостоящим, однако Лакнер рассчитывает со временем снизить себестоимость поглощения углерода и его хранения.

**P.S.**

Инструктор в горах говорит туристам:

- Это очень опасный склон, но, если вы все-таки сорветесь, то не забудьте посмотреть направо - редкой красоты вид открывается...

**ЭКАЛАГІЧНЫ СЕКТАР**

## ВНИМАНИЕ!

*По просьбам слушателей курсов начало занятий переносится на 1 июля (сессия, знаете ли). Мы рады сообщить, что у тех, кто не успел подать заявку на участие в программе ещё есть шанс. До 15 июня 2003г. остаются 5 вакантных мест.*

## ПРОДОЛЖАЕТСЯ НАБОР НА КУРСЫ МОЛОДЫХ ПОЛИТИКОВ

**Темы лекций:** избирательное законодательство и избирательные технологии; "чёрный пиар" и борьба с ним; политические системы; статус и полномочия депутатов различных уровней.

Предполагается, что лучшие слушатели будут иметь возможность пройти стажировку в странах Восточной Европы и получить практические навыки политической деятельности в РБ.

**Обучение бесплатное.** Занятия будут проходить в вечернее время **2 раза в неделю**.
**Срок обучения -** 2 месяца (июль-август 2003г.).
Преподаватели: тренеры Национально-демократического института США.

Количество мест ограничено. **Критерии отбора:**
- Возраст: 18-30 лет (предпочтение - лицам с высшим образованием и студентам ВУЗов);
- Желание и возможность принять участие во всех мероприятиях программы;
- Желание и возможность реализовать полученные знания на практике;
- Оперативность, полнота и достоверность ответов на вопросы анкеты.

**Для участия в программе необходимо ответить на вопросы анкеты-заявки:**
1. ФИО. 2. Контактный адрес, тел., e-mail. 3. Место работы, учёбы (указать полностью).
4. Возраст. 5. Партийность. 6. Членство в общественных и религиозных организациях.
7. Почему Вы решили принять участие в программе подготовки молодых политиков?
8. Опыт участия в избирательных кампаниях, другой политической деятельности (если есть).
9. Каким образом Вы планируете применить полученные знания и опыт?
10. Какими, на Ваш взгляд, должны быть перспективы развития Беларуси в следующих областях:
а) Экономика; b) Социальная сфера; c) Образование; d) Национальная культура и язык;
e) Внешняя политика; f) Права человека.

**Объём анкеты - до 2-х печатных листов формата А4.**
**Анкеты-заявки присылать до 14 июня 2003 г. по адресу:** г. Брест, ул. Ленинградская, д. 1, кв. 81.
**Доп. информация по тел.: (029) 641-20-98.**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 22-90-97.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 22-90-97.**

# У ВОБЛАСЦІ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ПАПУЛЯЦЫЯ БАБРОЎ

КАЛІ ЯШЧЭ ГАДОЎ ДВАЦЦАЦЬ ТАМУ ЗАНЕСЕНЫЯ Ў ЧЫРВОНУЮ КНІГУ БЕЛАРУСІ БАБРЫ БЫЛІ Ў БЕРАСЦЕЙСКАЙ ВОБЛАСЦІ НАДЗВЫЧАЙ РЭДКАЙ З'ЯВАЙ, ДЫК ЗАРАЗ ПРЫРОДАЗНАЎЦЫ КАНСТАТУЮЦЬ, ШТО ПАПУЛЯЦЫЯ ГЭТЫХ ЖЫВЁЛ ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ.

Напрыклад, на рацэ Лясная бабры раней амаль не сустракаліся, а зараз сляды іх жыццядзейнасці можна заўважыць у гэтых мясцінах паўсюль. Зыходзячы з вынікаў перапісу дзікага жывёльнага свету ў мінулым годзе, якія знаходзяцца ў абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, бабры, сярод асноўных відаў жывёльнага свету, далі найвялікшы прырост. За год іх стала больш у вобласці на 814 асобінаў, а агульная колькасць дасягнула 3208.

Некаторыя спецыялісты не выключаюць, што частка баброў у пошуках корму і больш спрыяльных умоў для існавання мігрыравала да нас з-за Буга, дзе іх папуляцыя ў апошні час таксама значна павялічылася. Аднак станоўчы вынік, безумоўна, далі і ахоўныя мерапрыемствы ў адносінах да гэтых жывёл, якія ў свой час амаль цалкам зніклі ў Беларусі.

# ПОЖАР В ПРИПЯТСКОМ ЗАПОВЕДНИКЕ

БОЛЕЕ ДВУХ ТЫСЯЧ ГЕКТАРОВ ЛЕСНЫХ УГОДИЙ ВЫГОРЕЛО В ПРИПЯТСКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ РАДИАЦИОННОМ ЗАПОВЕДНИКЕ. ПРИЧИНОЙ ВОЗГОРАНИЯ СТАЛ ПОДЖОГ СУХОЙ ТРАВЫ.

Сумма ущерба, нанесенного огнем лесным угодьям, составила более 200 миллионов рублей. По факту причиненного окружающей среде ущерба возбуждено уголовное дело. В результате расследования было установлено, что группа рабочих производила в заповеднике заготовку саженцев деревьев. После напряженного труда рабочие объявили перекур. Один из рабочих бросил на землю горящую спичку. В результате сухой ветреной погоды пожар возник практически мгновенно. Рабочие предприняли попытку справиться с огнем самостоятельно, забрасывая очаги пожара землей.

# ШВЕДСКИЙ ОПЫТ В ЭНЕРГЕТИКЕ

С РАБОТОЙ ШВЕДСКИХ ЭЛЕКТРОЭНЕРГЕТИЧЕСКИХ ОБЪЕКТОВ ОЗНАКОМИЛСЯ МИНИСТР ЭНЕРГЕТИКИ БЕЛАРУСИ ВЛАДИМИР СЕМАШКО, ПОСЕТИВ В СОСТАВЕ ОФИЦИАЛЬНОЙ ДЕЛЕГАЦИИ НАШЕЙ СТРАНЫ СТОКГОЛЬМ.

На сегодняшний день в Швеции до 25 процентов электроэнергии вырабатывается за счет использования местных видов топлива. Здесь для этих целей создана целая система сбора древесных отходов, получаемых при промышленной заготовке и переработке леса. В Беларуси же пока нет электростанций и теплоэлектроцентралей, которые бы работали на местном сырье. Изучив шведский опыт, Владимир Семашко поручил специалистам концерна "Белэнерго" проработать вопрос создания в Беларуси станции на местных видах топлива.

**ЭКАЛАГІЧНЫ СЕКТАР**

АБ'ЯВЫ

# КІЕВА-МАГІЛЯНСКАЯ АКАДЭМІЯ ЗАПРАШАЕ НА ВУЧОБУ

Кансорцыум эканамічных даследаванняў і адукацыі (The Economics Education and Research Consortium (EERC) і Кіева-Магілянская Акадэмія (Кіеў, Украіна) запрашаюць зацікаўленых асобаў з Украіны, Беларусі і Малдовы прынясць удзел у міжнароднай праграме даследаванняў і навучання па эканоміцы на 2003-04 і 2004-05 акадэмічныя гады.

Для ўдзелу ў праграме неабходна мець: дыплом аб закончанай вышэйшай адукацыі на час падачы заявы; добрае веданне ангельскай мовы; добрыя веды па матэматыцы.

Прыярытэтная спецыялізацыя па эканоміцы пажаданая, але не абавязковая.

Апошні тэрмін дасылання дакументаў - 1 ліпеня 2003 г.

Дадатковая інфармацыя:
http://www.eerc.kiev.ua,
тэл. (38-044) 239-2494
або праз e-mail: eerc@eerc.kiev.ua.

**Dzedzich week-news**

# СТЫПЕНДЫЯ ІМЯ ГЁТЭ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА ЦЮРЫНГІІ

Стыпендыя складае 1000 еўра штомесяц і забяспечвае трохмесячную працу стыпендыята ў адным з ВНУ альбо даследчыцкіх арганізацый Цюрынгіі (Германія). Штогадова гэтую прэмію атрымліваюць чатыры аспіранты з розных краінаў. Перавагай карыстаюцца тэмы, звязаныя з нямецкай літаратурай, музыкай, мастацтвам, культурай, гуманітарнай гісторыяй у кантэксце кантактаў Цюрынгіі з Еўропай.

Удзельнік конкурса павінен мець дыплом аб закончанай вышэйшай адукацыі з адзнакамі вышэй за сярэднія, добра валодаць нямецкай мовай, узрост не павінен перавышаць 35 гадоў.

Заявы на стыпендыю мусяць уключаць: аўтабіяграфію ў выглядзе табліцы са звесткамі аб навуковай дзейнасці; тэму даследчыцкай працы з асноўнымі тэзісамі і працоўным планам; дзве рэкамендацыі ад навуковых кіраўнікоў працы; ацэнку ведаў нямецкай мовы; звесткі аб іншых стыпендыях, на якія канкурсант падаў заяўкі.

Апошні тэрмін падачы заявак на атрыманне стыпендыі - 31 траўня.

Кантактная асоба: Thüringer Staatskanzlei, Referat 24, Regierungsstraße 73, 99096 Erfurt, Ursula Heinemann, e-mail: HeinemannU@TSK.thueringen.de, MohrM@TSK.thueringen.de

**Dzedzich week-news**

# ДАПАМОГА ДЛЯ ІНТЭРНЕТ-РЭСУРСАЎ

Працягваецца праграма грантаў ад By.COM Belarus для аўтараў перспектыўных некамерцыйных праектаў у Інтэрнеце. Каб атрымаць падтрымку, трэба дакладна сфармуляваць, чаму менавіта гэты праект неабходна падтрымаць і як аўтары збіраюцца яго развіваць.

Падрабязнае апісанне праекта і спасылку на яго (калі яна ёсць) трэба накіраваць на e-mail: info@belarus.by.com.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць на сайце: www.belarus.by.com.

Алеся Навіцкая, "Хроніка грамадскага жыцця Гарадзеншчыны".

**Dzedzich week-news**

**Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-ДЫЗАЙНЕРА

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**

**Тэл.: 22-90-97.**




*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*

**RR**

РАДЫЁ РАЦЫЯ

***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***

*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*

***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***

*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*

**WWW.RACYJA.PL**

Брэсцкае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР**

**«ВЯСНА»**

**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.

## БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

## ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўлінея, д. 20, кв.2.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго: ______

## УВАГА!

Працягваецца бясплатная падпіска
**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:
**224000, г.Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв. 2.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: ______

Прозвішча: ______

Імя: ______

Імя па бацьку: ______

Паштовы адрас: ______

Тэлефон: ______

## ВЯЛІКІ ПЕРАПЫНАК

На іспыце:
- Прафесар, не падкажаце, колькі часу?
- Вучыць трэба было!

***

Навіны са свету ядзернай фізікі.

Страўнік ў кацяняці не большы за напёрстак - адсюль вынікае, што тыя два літры малака, якія ён здольны выпіць на працягу гадзіны, знаходзяцца ў яго страўніку пад ціскам 50 тысяч атмасфер, што ў дзесяць разоў больш за ціск у эпіцэнтры ядзернага выбуху...

***

«Правалівай!» - буркнуў студэнт экзаменатару.

***

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ён стаміўся быць прэзідэнтам. Каранацыя прызначана на чацвер.

***

Што такое хуткасць святла?

Гэта калі вы паспяваеце выцягнуць з лядоўні бутэльку піва да таго, як паспее загарэцца лямпачка...

***

ТЭСТ НА ЗДОЛЬНАСЦЬ РАБІЦЬ ВЫСНОВЫ.
- З чаго пачынаецца рыбалка?
- Аб чым марыць мараплавацель?
- Чаго баіцца пілот падчас палёту?
- Дзеля чаго іншапланецянін на сваёй талерачцы ляціць у бок нашага Сонца?
- Чаго нікому не пазбегнуць?

Правільны адказ на ўсе пытанні – «зямля» (накапаць у, даплыць да, упасці на, даляцець да, закапаць у).

Для рускіх цалкам дапушчальны адказ – «гарэлка»…

***

Разумны лічыць, што ён такі ж як і ўсе, дурань – што ўсе такія ж як ён...

***

У кабінет венеролага нясмела заглядае дзяўчына:
- Доктар, да вас можна?
- Ну заходзьце, калі заляцелі.

## АБ'ЯВЫ

1. Група фінансістаў аб"яўляе ўзнагароду за галаву Бэн Ладэна - $ 1 млрд.
2. Група спецыялістаў па кланаванню запрашае Бэн Ладэна да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

***

Дзяўчына 180-120-180. Шукаю працу па ўкладцы шпалаў. Інтым не прапаноўваць.

***

Мяняю шклянку шмалі на зваротны квіток з Марса.

***

Новы тарыф ад VELCOM: «Добра пагулялі». Званкі з аддзяленняў міліцыі дахаты - бясплатныя!

З поспехам прадаецца новая мадэль мышкі для кампутара - з адкрывалкай для піва.

***

Дзень Святога Валянціна - гэта для дзяцей, а для дарослых ёсць ноч на Івана Купалу.

***

Падумаў аб жыцці - наляцелі мухі...

***

Сваіх мужоў раўнуюць толькі непрыгожыя жанчыны. Прыгожым не да таго: яны раўнуюць чужых...

***

- Дурань вучыцца на сваіх памылках, разумны - на чужых. Атрымліваецца, што разумныя вучацца ў дурняў?

***

Чым менш у чалавека грошаў - тым лягчэй яму знайсці выпіўку...

***

Забіў араба - выратаваў самалёт!

***

Няхай жыве наша заканадаўства, якое нас усіх заканадала!

***

Цешча загадзя парвала ўсе баяны, калі яшчэ толькі захварэла...

***

Другое правіла для аўтамабілістаў:
- У большасці выпадкаў прычынай дрэннага кіравання аўтамабілем зімой з"яўляецца не лёд, а тое, ува што яго дадавалі...

***

- Дзяўчына, вы хацелі б заняцца бізнесам?
- Так, але каб маці не даведалася.

***

Жарт дня.

Некалькі разоў трэба чыхнуць у перапоўненым аўтобусе і гучна прамармытаць: «Каб я яшчэ калі-небудзь паехаў у Кітай...»

***

У гета маленькая дзяўчынка з вялікім кляймом зоркі Давіда на ілбе. Міма праходзіць фашыст ды пытае:
- Юда?
-Не, блін, тэхаскі рэйнджэр!!!

***

Пытанне да Армянскага радыё:
- Чаму па артыкуле Крымінальнага Кодэксу Беларусі за абразу прэзідэнта ў мінулым годзе пакарана так мала людзей?
- Таму што ніхто не жадае асабіста адказваць за тое, што і так усе ведаюць.

***

Апячатка:

Герой беларускага народнага эраса.

***

- Плёткам нельга верыць! Мне вось казалі, што муж здраджвае, а я ўзяла ды і праверыла. Не! Не здраджвае! ¨н увесь час толькі з сябрам сваім разам. І на рыбалку, у кіно, у тэатр... Яны нават спяць разам!

***

...ЗША згортваюць праграму "нафта ў абмен на харчаванне" і разгортваюць новую: "нафта на ХАЛЯВУ".

# ЯК ПРАВАЛІЦЬ ІСПЫТ

НАБЛІЖАЕЦЦА ЧЭРВЕНЬ, А РАЗАМ З ІМ, КАНЕШНЕ Ж, СЕСІЯ. КАЛІ ВЫ НІЧОГА НЕ ВЕДАЕЦЕ – ПРАВАЛІЦЕ ІСПЫТ СТЫЛЁВА! ПРАВАЛІЦЬ ІСПЫТ – ШТО МОЖА БЫЦЬ СМЕШНЕЙ! ТРЭБА ЎМЕЦЬ ГЭТА РАБІЦЬ.

ВОСЬ НЕКАЛЬКІ АРЫГІНАЛЬНЫХ СПОСАБАЎ:

- Прынясіце з сабой падушку і засніце на ёй (альбо зрабіце выгляд, што спіце). Прачніцеся за 15 хвілін да канца іспыта і скажыце: «Во блін, працаваць жа трэба!» - і пачніце хутка страчыць. Здайце працу за некалькі хвілінаў да канца.
- Вазьміце білет і з воплем: «Андруха, я дастаў сакрэтны дакумент!" вылятайце з аудыторыі.
- Калі іспыт па матэматыцы або фізіцы, напішыце адказ разгорнута і па-мастацку. Калі гэта сачыненне, складзіце яго з матэматычных сімвалаў. Фантазіруйце. Карыстайцеся значком інтэграла.
- Не змаўкайце на працягу ўсяго іспыта. Чытайце пытанні ўслых, абмяркоўвайце іх самі з сабой. Калі папросяць заткнуцца, выкрыкніце: «Блін, вы што, чуеце, як я разважаю?!»
- Увайдзіце ў аўдыторыю, вазьміце заданне, сядзьце за парту. Праз пяць хвілін гучна скажыце экзаменатару: «Я нічога не разумею. Я наведваў лекцыі ўвесь семестр. Што за фігня? І хто Вы ўвогуле такі? Дзе наш выкладчык?».
- Прыдумайце вартую прычыну не адказваць на кожнае з пастаўленых пытанняў. Напрыклад: «На гэтае пытанне мне не дазваляе адказваць мая рэлігія». Фантазіруйце.
- Зайдзіце ў аўдыторыю, затраўлена азіраючыся. Уздыхніце з палёгкай. Падыдзіце да экзаменатара і скажыце: «Яны знайшлі мяне. Мне прыдзецца пакінуць краіну», - і сыдзіце.
- Напішыце адказ на замежнай мове. Калі вы не валодаеце ніводнай - не страшна - выдумайце самі! Падчас іспыту па матэматыцы карыстайцеся рымскімі лічбамі. Фантазіруйце.
- Напішыце адказ такім чынам, каб ён быў падобны на тэст з варыянтамі адказаў. Калі ў вас атрымалася, агучце найбольш цікавыя спалучэнні гукаў (БАБА, АВАВ, ГАД і г.д.).
- Наладзьце акцыю пратэсту перад экзаменатарам (напрыклад, пагражайце яму, што праз гадзіну пасля пачатку іспыту, незалежна ад таго, скончылі студэнты пісаць або не, усе ўстаюць і ідуць бухаць).
- Прынясіце з сабой шпаргалкі зусім па іншым прадмеце (па ЗУСІМ іншым прадмеце, напрыклад, шпаргалкі па гісторыі на экзамен па матэматыцы) і далучыце іх да задання з прыпіскай: «Патрэбнае глядзі ў дадатках».
- Прынясіце з сабою які-небудзь музычны інструмент і пачніце граць на ім розныя мелодыі. Калі папросяць, каб вы перасталі граць, адкажыце: «Гэта дапамагае мне думаць». Прынясіце разам з сабою падручнік і папрасіце экзаменатара знайсці главу пра музычныя інструменты. Не забывайце ўвесь час паўтараць: «Ну я ж казаў!».
- Напішыце, у якасці адказу на пытанне, «10 аргументаў, чаму прафесар казёл».

**Былыя студэнты III курса БрДУ**

№3 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
травень 2003

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
**Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі**

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 17.05.2003 у $18^{00}$
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, Д. Дзянісаў, Д. Шастак, М. Есіна, А.Верамчук, У. Чаберкус
**Адказны сакратар:** М. Сялягін. **Вёрстка:** А. Ляўчук

**Кантактны тэлефон:** (0162) 22-90-97
**E-mail:** dzedzich@mail.ru